Архівы за архівы ☞5

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Івонка Сурвіла ☞9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 45 (2634) Год LI | Беласток, 4 лістапада 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Традыцыйнае і новае ў „Бардаўскай восені”

Фестываль беларускай бардаўскай ды аўтарскай песні „Бардаўская восень 2006”, які з 27 па 29 кастрычніка праходзіў у Бельску-Падляшскім, Гайнаўцы і Беластоку, розніўся ад апошніх выпускаў. Звяз беларускай моладзі, які ўжо трынаццаты раз ладзіць гэтае мерапрыемства, рашыўся не праводзіць конкурснай часткі (так, як у час юбілейных фестываляў) і не браць прызначаных яму грошай з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. Грамадская праца студэнтаў і ліцэістаў з фінансавай падтрымкай спонсараў дазволілі наладзіць канцэрты з зоркамі бардаўскай песні. Публіцы прапанаваліся таксама творы, якія не супадаюць з канонамі традыцыйнай аўтарскай песні.

Злева: Лукаш Плева, Юрка Ляшчынскі (журналіст Радыё Беласток, які вёў мерапрыемства), Віктар Шалкевіч

— Хаця мелі мы надзеленыя Міністэрствам унутраных спраў і адміністрацыі сродкі на арганізаванне „Бардаўскай восені” і „Зімовых сустрэч”, рашыліся мы не карыстацца імі. Дайшлі мы да вываду, што няма ўжо задавальнення ладзіць мерапрыемства паводле выпрацаванай ад гадоў схемы, а пасля многа часу рабіць падлікі, якіх патрабуюць міністэрскія чыноўнікі. У мінулых гадах трэба было больш часу займацца бухгалтарскімі справамі, чым арганізацыяй музычных сустрэч, што знеахвочвала маладых людзей да працы ў карысць беларускай культуры і ўсяго нашага грамадства, — заявіў Лукаш Плева, старшыня Звязу беларускай моладзі і адначасна дабаўляе, што ўсе разлікі арганізаванай у мінулых гадах „Бардаўскай восені” былі станоўча ацэнены міністэрскімі кантралёрамі. — Зразумела, што з абмежаванымі сродкамі цяжка было б наладзіць нам конкурсную частку фестывалю і мы рашыліся паставіць на зоркі бардаўскай песні. Выходзім таксама з прапановай іншай музыкі.

Алег Кабзар выступіў з рэфлексіўнымі песнямі

На суботні канцэрт у Бельскі дом культуры прыйшло многа маладых (і не толькі) людзей паслухаць старыя песні ў выкананні зорак і новыя хіты сваіх любімцаў. У зале пераважалі вучні, сярод якіх была вялікая група моладзі Гайнаўскага белліцэя з настаўнікамі. Маладую публіку найбольш узрушыў Лявон Вольскі. Моладзь горача апладзіравала пасля песень з „Народнага альбома”, „Крамбамбулі”, „Я нарадзіўся тут”, ды навейшых твораў. Паміж песнямі Лявон Вольскі чытаў празаічныя творы, якія з мастацкім ухілам расказвалі пра беларускую рэчаіснасць. Пасля выступу любімца моладзі, вучаніцы бегалі за Лявонам Вольскім, каб здабыць яго аўтограф. Ліцэістам і студэнтам таксама моцна спадабаўся выступ саліста Кроў з гурту „Чырвонае па беламу”, які, прэзентуючы музыку рап разважаў аб сакавіцкіх падзеях у Беларусі, ці паслядоўнасцях чарнобыльскай аварыі. Заявіў ён, што на канцэрт падрыхтаваў больш спакойныя песні, якія падыходзяць да бельскіх бардаўскіх кліматаў.

— Трэба аставацца з традыцыяй і шукаць новага, — заявіў Ігар Лукашук, былы старшыня ЗБМ і шматгадовы галоўны арганізатар бардаўскага мерапрыемства.

Алег Кабзар спяваў пад гітару, з дапамогай Марка Яраша (гітара). Выступіў ён з рэфлексіўнымі песнямі на словы вядомых беларускіх паэтаў. Суботні канцэрт, які доўжыўся пад чатыры гадзіны, завяршыў Віктар Шалкевіч, які спяваў пад акампанемент сваёй гітары і музычных інструментаў сябраў (фартэпіяна і кантрабас). Многа эмоцый выклікалі некаторыя аўтарскія песні Віктара Шалкевіча, змест якіх правакаваў да дыскусіі. Выступаў ён таксама са сваёй праграмай у пятніцу ў Цэнтры прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка” ў Гайнаўцы.

У пятніцу перад бяльшчанамі выступілі былыя вучаніцы Бельскага белліцэя Кацярына і Мажэна Жменька, якіх творы былі накіраваны перад усім да моладзі. Ілона Карпюк („Ілo з сябрамі”) спявала пад інструментальную музыку, а яе тэксты схілялі да задумы і рэфлексіі. У нядзелю ў эфіры Радыё Беласток прагучалі песні ў выкананні Віктара Шалкевіча і гурту „Ілo з сябрамі”, якія былі накіраваны да шырокай публікі.

— Трэба, каб „Бардаўская восень” не стаяла на месцы. Можа ў наступныя гады запрапануем іншую музыку, — заявіў Лукаш Плева ў размове з „Нівай” — медыйным патронам мерапрыемства.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Лявон Вольскі традыцыйна захапіў маладую публіку

БАС

25-годдзе БАСу

Беларускае аб'яднанне студэнтаў аб'яўляе:

Юбілей будзем святкаваць 24 лістапада 2006 г. у Фальварку Надаўкі, што каля скансэна (дарога з Беластока на Аўгустаў), пачатак у 18 гадзін. Усіх БАСаўцаў шчыра запрашаем пацвярджаць прыбыццё па каардынатах:

тэл./факс +48 85 743 50 22
тэл. +48 507 08 08 07
mail: biuro@basowiszcza.org

Уся праграма святкавання:

Варшава

Białoruski Underground (Беларускі андэрграўнд — беларускі музычны незалежны форум)

17.11.2006 г.

Cafe Kulturalna (PKiN, Teatr Dramatyczny, Plac Defilad 1)

21.00 Канцэрт гуртоў: Troitsa, Yerba Mater

18.11.2006 г.

CDQ вул. Burakowska 12

20.00 Канцэрт гуртоў: Czyrwonym pa Bielym, Tav. Mauzer, Neuro Dubel, Alians

Беласток

21.11.2006 г.

Klub Gwint, вул. Zwierzyniecka

19.00 Канцэрт гуртоў: Triquetra, 5set5, Hey

22.11.2006 г.

Cabaret Klub&Restauracja, вул. Kilińskiego 13

19.00 Адкрыццё выстаўкі „(ze)wnętrza”

23.11.2006 г.

Yzzy Bar&Disco, вул. Legionowa 14/16

20.00 Студэнцкія атрасіны і беларуская дыскатэка

24.11.2006 г.

Folwark Nadawki (каля скансэна, дарога з Беластока на Аўгустаў)

18.00 Юбілейнае святкаванне БАСу

25.11.2006 г.

Folwark Nadawki (каля скансэна, дарога з Беластока на Аўгустаў)

Падляшскія запусты

12.00 Абрады, фільмавыя прэзентацыі

16.00 Канцэрт і гульня з гуртамі: WZ Orkiestra, Rima, Horpyna, Pałac, Brathanki

9 770546 196000

Хабар у нашым табары

„У нас у краіне так — пакуль хабар не дасі, змаганне з карупцыяй не пачнецца!” Згадалася мне гэтая жартоўная показка, калі аб’явілі пра тое, што беларускія памежнікі будуць прэміравацца грашыма за адмову ад... хабару. Уводзіцца гэтая мера, калі верыць дзяржаўным сродкам інфармацыі (а як жа ім не паверыць!) абсалютна заканадаўча па ўсёй краіне, а не як нейкая эксперыментальная лакальная ініцыятыва. Можа я памыляюся, але здаецца, што ў сусветнай практыцы па забеспячэнні дзяржаўнай граніцы, ды і ўвогуле ў змаганні са злосным хабарніцтвам, такога яшчэ не было. Цікава, як будзе дзейнічаць гэты найноўшы механізм матэрыяльнага стымулявання? Апрыёры, чалавек, які ідзе на ахову дзяржаўнай мяжы, атрымлівае свой заробак за выкананне службовых абавязкаў, што аўтаматычна прадугледжвае адмову ад подкупу. А тут такая „творчая” мера. Прасцей кажучы, у нашых рэаліях гэта абазначае наступнае: кожны, хто па той ці іншай прычыне не спадабаецца непадкупнаму стражніку мяжы, рызыкуе быць названым хабарнікам і адпаведна быць пакараным. І ўжо мала яму не пакажацца. Не хочацца думаць, што доблесныя беларускія памежнікі ўсе як адзін кінуцца „інспіраваць” сабе прэміяльныя. Але ж існуе ў сістэме такі панятак як план. І калі прэміяльныя прадугледжаныя, то іх трэба некаму выплачваць. Так што цяпер паводле новай пастановы мусіць разгарнуцца кампанія па павышэнні маральнага вобліку памежнікаў.

А што калі і ў іншых структурах і галінах увесці такія „стымулятары”. Раз у нашым табары пачалося змаганне з хабарам. Ударым непадкупным кулаком дзяржаўнай свядомасці і жалезным ключом юстыцыі па галаве хабарнікаў і злодзеяў! Так што сцеражыцеся кантрабандысты і аферысты, гусякрады і канакрады — на ўсіх вас праведзены адпаведныя нарады і распрацаваны спецаперацыі!

Як у нас змагаюцца насамрэч з карупцыяй, добра вядома. Прывяду колькі рэальных прыкладаў. Лекар выпісаў „пацыенту” фальшывы „бальнічны” (медыцынскі лісток, які вызваляе на пэўны тэрмін з працы), узяўшы „за паслугу” дваццаць долараў. Прысуд „вялікаму злачынцу” быў надзвычай жорсткі — шэсць гадоў турэмнага зняволення з канфіскацыяй маёмасці. Безумоўна, за хабар трэба караць. Але каб так паламаць чалавеку ўсё жыццё! Міжволі згадваюцца сталінскія часы, калі людзей садзілі ў канцлагеры за падабраныя каласкі з калгаснага поля. Ёсць такое выслоўе, што гісторыя паўтараецца ў выглядзе фарсу. Аднак, які тут фарс, калі шасцідзесяцігадовую хворую пенсіянерку на мінулым тыдні (фармальна за напісаны [але нікуды не адпраўлены!!!)] ліст, а фактычна за грамадскую праваабарончую дзейнасць) пасадзілі на два гады рэальнай турмы? Што гэта, калі не праява сталінізму, бо нават пры Хрушчове ці Брэжневе за напісанае, але не пасланае, такіх рэпрэсій не было!

Была гісторыя, калі неяк у сумленнага чалавека, які падвозіў на сваім легкавіку „падонка з пасведчаннем”, забралі машыну. У даносе выяўленца „непрацоўных даходаў” была напісана наступная фармулёўка: „Кіроўца, які мяне падвозіў, намерваўся ўзяць грошы”. І гэтага было дастаткова, каб пазбавіць аўтамабіліста маёмасці. Ужо пазней выявілася, што канфіскаваная машына была прададзена блізкаму сваяку таго, хто быў з пасведчаннем.

Яшчэ адзін дзікі выпадак. Выкладчыцы аднаго універсітэта студэнты паднеслі кветкі і цукеркі. Тая і ўзяла, не падумаўшы, што гэта была звычайная подлая „падстава”. Што вы думаеце ў выніку? Вымова, штраф, звальненне з працы? Памыляецеся. Тыя ж шэсць гадоў турмы з канфіскацыяй маёмасці. Кажуць, што пасля гэтага выпадку студэнты сталі звышнахабныя, а бедныя выкладчыкі цяпер не ведаюць, як ім дагадзіць.

Кожная дзяржава мае свой карны апарат, свае структуры прэвентыўнасці і прадухілення парушэнняў. Хабар, як праява разумення развязання праблемаў, існуе, напэўна, ад пачатку свету. І аніводнай дзяржаве не ўдалося яго выкараніць дарэшты. Але па тым, наколькі адэкватна і справядліва за яго караюць, можна меркаваць пра сутнасць дзяржавы. Вялікая ж карупцыя любіць хавацца за малым хабарніцтвам.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Чаму мусім паміраць?

Традыцыйна ўжо 1 лістапада наведваем магілы блізкіх, запальваем на іх лампадкі, ставім кветкі... У гэты дзень могілкі запаўняюцца людзьмі, часта таксама прыходзяць святары, каб за некаторую аплату згаварыць кароткую малітву і пасвяціць месцы вечнага спачынку. У некаторых могільнікавых царкоўках, напр. у Орлі, адпраўляюць яны ютрані, абедні, вячэрні.

Прадаўцам хрызантэмаў і лампадак гэта дзень асаблівага жніва. Аднак усім гэты дзень з’яўляецца часам успамінаў і роздумаў пра наша жыццё, пра яго каштоўнасць і мімалётнасць. Асабліва цяжкія пачуцці ахопліваюць сваякоў пакойнікаў, якія знячэўку або змоладу пакінулі гэты свет. І часта ўзнікаюць пытанні: чаму мусім паміраць, як доўга можа жыць чалавек?..

У нашым свеце ўладарыць смерць, якая для нікога не мае спагады. Нейкі паэт сцвярджаў:

Шпаркім крокам шагае смерць
І не пытаўшы дазволу
Яна косіць жыцця цвет
У хатах і харомах.

Гэтыя жахлівыя візіты пакідаюць у многіх людзей не толькі балючыя раны, але і трывогу за лёс дарагіх ім пакойнікаў. Смерць магутна і трыумфальна крочыць па зямлі, пажынаючы жыццё за жыццём і наводзячы глыбокі сум на мільёны людзей. І ў многіх сэрцах узнікаюць пытанні: Навошта ўсё гэта? Хто разгадае сэнс жыцця?..

Такія пытанні людзі ставілі тысячагоддзямі, але адказаў не знайшлі. Гэтая праблема прысутная і ў Бібліі. „Стварыў Бог чалавека з праху зямлі, і ўдыхнуў у яго дух жыцця, і стаў чалавек жывой істотай” (Быццё 2, 7) І далей: „З нялёгкай працы будзе твой хлеб, пакуль не настане час вярнуцца табе ў зямлю, з якое ты ўзяты; бо ты прах і ў прах вернешся” (Быццё 3, 19), — пачуў выганяемы з раю першы чалавек. А Прапаведнік дадаў: „І вернецца прах у зямлю, якою ён быў, а дух вернецца да Бога, які яго даў” (Экл. 12, 7)

Чым з’яўляецца смерць? Біблія адказвае: „Праз аднаго чалавека грэх прайшоў у свет, а праз грэх смерць...” (Рым. 5, 12)

Як доўга можа жыць чалавек? Сярэдняя працягласць жыцця не выходзіць сёння за 70-80 гадоў. У Бібліі згадваецца пра людзей, якія жылі намнога больш. Ды і цяперашнія навіны ўключаюць сенсацыйныя паведамленні пра неардынарных даўгавечных. Біяэтык Джон Харыс сказаў, што цяпер даследчык можа заглянуць у свет, у якім старэнне і смерць трацяць непазбежнасць. Паводле некаторых вучоных да канца гэтага стагоддзя можа счэзнуць абмежаванне даўжыні чалавечага жыцця, калі стане магчымым бесканечнае размнажэнне клетак.

Дагэтуль на працягу жыцця цэлы наш арганізм некалькіразова аднаўляецца. Пасля прыблізна сямі гадоў становімся новымі людзьмі. Гэты працэс абмежаваны, бо пасля акрэсленага ліку падзелаў клеткі перастаюць множыцца. Калі б не гэта, мяркуюць вучоныя, дык чалавечае цела магло б аднаўляцца нават бясконца.

Мы можам задумацца над дзівоснай ёмкасцю чалавечага мозга, якой вялікай часткі не выкарыстоўваем на працягу адносна кароткага жыцця. Чаму ў яго закладзены такія вялікія магчымасці? Ці дзеля таго, каб усю вечнасць напаўняць яго ведамі?

У адказ на такое пытанне можам паціснуць плячыма. Многім такая перспектыва здалася б непрыцягальнай, бо вечнае жыццё было б нуднае, так як экзістэнцыя многіх пенсіянераў, якія без занятку праседжваюць перад тэлевізарам. Вечнае жыццё на зямлі дало б шырокія магчымасці для развіцця розных зацікаўленняў; дапытлівыя людзі палічылі б гэта блаславленнем. Яно магло б стварыць бязмежную магчымасць пакланення Богу і тады яго нельга было б лічыць бескарысным і нудным. Але яно было б страшэннай мукай тым, у якіх розум абмежаваны, якія лічаць, што ўжо ўсё ведаюць. Яны не ведалі б, чым напоўніць час.

А што з пакойнымі, дзе яны прабываюць? Біблія ў гэтым пытанні стрыманая і можам меркаваць, што калі цела паддаецца гніенню, тады душа адпраўляецца ў краіну памерлых. Месцазнаходжанне краіны памерлых не ўстаноўлена: адны мяркуюць што яно ў глыбіні зямлі, іншыя — што ў нябесных прасторах. Адно пэўнае, што Творца такое месца адвёў у абшырным свеце. І чым там душы займаюцца, таксама не ведаем.

Ці ў свеце памерлых можна сустрэцца і пазнаць сябе? Можна, так як апосталы пазналі Майсея і Ілью, што паказаліся Збавіцелю на гары Фавор. Бывала, што некаторыя людзі, захоўваючы прытомнасць да самога скону, заклікалі сваіх пакойных ужо блізкіх і паведамлялі пра свой да іх прыход.

Мільёнам людзей Біблія раскрывае шанц уваскрэсення і жыцця ў райскай зямлі. У тым новым, дасканалым свеце не будзе ўжо месца смерці, бо яна з’яўляецца апошнім нашым ворагам, які будзе пераможаны.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Вачыма еўрапейца

Падляшскі акмаген

— Варта запытацца пра культуру, — пад такім лозунгам другі раз адбыўся ў Тыкоціне сімпозіум, які ўжо год таму ініцыявалі падляшскія самаўрадавыя ваяводскія ўлады ды прадстаўнікі творчых асяроддзяў. Як заяўлена на інтэрнэт-старонках Падляшскай маршалкоўскай установы, мае ён быць „дальнабачнай праграмай, якая будзе істотнай часткай стратэгіі рэгіянальнага развою”. Год таму, у Сейнах і Вігерскім кляштары, тэмай сімпозіума было „будаванне рэгіянальнай тоеснасці ў аснаванні на культурную спадчыну і сучасныя выклікі, якія стаяць перад Польшчай і нашым рэгіёнам”.

Гэта ўжо было мэтай — як здаецца — упісваючыхся ў падляшскую традыцыю такіх сімозіумаў. Вось, можна прачытаць, што мае быць: ангажаванне культурных асяроддзяў у рэгіянальны развой, сучасныя працэсы будавання тоеснасці рэгіёна, яго прамоцыя і канкурэнтнасць у краёвым і міжнародным маштабе. Апрача згаданых сярод мэт апынуліся заявы ў чыста памайстэрску чыноўніцкім стылі: інтэграцыя творчых асяроддзяў, генераванне супольных праграмных ініцыятыў, актывізаванне дыялогу творчых асяроддзяў з іншымі партнёрскімі асяроддзямі ў рэгіёне, працы над уладсканальваннем узроўню культуры ў рэгіёне, мабілізацыя творчых амбіцый і да гэтага падобнае, і гэтак далей.

Сёлета гэтае актывізаванне, мабілізаванне і генераванне (магло б гучаць гэта: акмаген), датычыла „перспектывы супрацоўніцтва культуры з людзьмі бізнесу дзеля супольнай мэты, якой з’яўляецца рэгіянальны развой у сферы так эканамічнай, як і духовай”. Праўда, якая кашмарная мова! Ды кіньма гэта. Здамінаваны лявіцай, адыходзячы ваяводскі самаўрад прыняў на сябе ролю пасрэдніка паміж прыватнымі ды дзяржаўнымі прадпрымальнікамі і тымі, хто займаецца культурай. Ні адзін, ні другі бок не прыкмеціў беларускага элементу. Дыялог культура — бізнес адбываўся з націскам на літоўскія матывы. Дарэчы, не без рацыі адным з мадэратараў сімпозіума быў дырэктар Асяродка „Пагранічча — мастацтваў, культур, народаў”, асацыяцыі, якую ўтрылівае ваяводскі самаўрад. Гэты асяродак ад гадоў займаецца рознага роду дзеяннямі, у асноўным засяроджваецца аднак галоўным чынам на польска-літоўскіх і польска-яўрэйскіх адносінах. Ва ўяве пагранічча „Пагранічу” не хапае месца на падляшска-беларускае мастацтва, культуру і грамадскасць. „Акмаген” мясцовай ваяводскай улады ў сёлетнім выпадку пытанняў аб культуру не датачыў беларусаў. Варта тут яшчэ паказаць на факт, што гаспадаром сімпозіума і шаноўным яго патронам быў маршалак ваяводства Януш Кшыжэўскі (СЛД).

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Самаўрадавы Сеймік — трап у 10

Навуковыя працаўнікі Універсітэта ў Беластоку: гісторык, праф. Яўген Мірановіч ды паэт Ян Чыквін ды галоўны рэдактар „Ніві”, старшыня Беларускага Саюза ў РП Яўген Вапа адкрываюць выбарчыя спіскі Беларускага выбарчага камітэта ў падляшскі Сеймік. Мабыць, шчасліва на выбарах у самаўрадавыя ваяводскія ўлады БВК выйграў у жараб’ёўцы нумар 10 (у Гарадскую раду Беластока — 16). У акрузе н-р 1 (горад Беласток), дзе здабыць агулам можна 7 мандатаў, якраз спісак у сем асоб адкрывае Яўген Мірановіч, вядомы гісторык і публіцыст:

Яўген Мірановіч

— Найважнейшая — гаспадарка. Ад многіх гадоў гаворыцца аб падтрымцы Усходняй сцяны, ды на практыцы з гэтага нічога не вынікае. Асабліва, калі глянуць на інфраструктуру паўднёва-ўсходняй часткі Беласточчыны.

Віталь Луба

У першай акрузе зараз за праф. Мірановічам за мандат стараецца вядомы ледзь не ва ўсім свеце пісьменнік родам з Крынак — Сакрат Яновіч. За Сакратам Яновічам на спіску стаіць прозвішча журналісткі „Нівы” Ганны Кандрацюк-Свярубскай, якая рэдагуе старонкі для дзяцей і моладзі „Зорка”:

— Я за тое, каб давесці да годнага адсвяткоўвання ў Беластоку і ў рэгіёне праваслаўных свят, хоць бы Каляд і „Сільвестра” так, каб усе маглі іх супольна правесці. Я хачу працаваць дзеля людзей з мешаных сужонстваў, каб інтэграцыя была чымсьці рэальным, а не толькі лозунгам. Моладзі з нашага рэгіёна трэба абавязкова даць шанц прабіцца. І Сеймік можа ў гэтым дапамагчы таксама выкарыстоўваючы еўрасаюзныя грошы.

У акрузе н-р 1 БВК вылучыў яшчэ Радаслава Дамброўскага, Пятра Германюка, Арнольда Тачыскага і Івону Будко.

У пяцімандатнай **акрузе н-р 4** (паветы: Бельскі, Сямятыцкі, Замбраўскі і Высакамазавецкі) лідэрам спіска з’яўляецца паэт Ян Чыквін, старшыня Беларускага літаратурнага аб’яднання „Белавежа”:

— Несумненна, я прадстаўляў бы інтарэсы важныя для нашага літаратурнага, ды і не толькі, беларускага асяроддзя. Варта ўрэшце на ваяводскім самаўрадавым форуме крануць пытанні стварэння Беларускага цэнтра культуры. Новыя магчымасці наконт гэтай тэмы даюць еўрасаюзныя праграмы. У гэтым тэрміне маем магчымасць такі асяродак стварыць.

Ян Чыквін

Спісак закрывае таксама паэтэса — Надзея Артымовіч з Бельска-Падляшскага. Апынуліся на ім яшчэ Віталь Луба, Ганна Шайкоўская і Уладзімір Сахарчук.

Уладзімір Сахарчук

Па адукацыі гісторык, шматгадовы настаўнік, шэф Беларускага саюза ў РП Яўген Вапа кандыдуе як першы ў васьмімандатнай **акурзе н-р 5** (паветы: Беластоцкі, Гайнаўскі, Монькаўскі і Сакольскі):

— БКВ ідзе на выбары ў Сеймік як натуральнае дапаўненне беларускіх камітэтаў, якія змагаюцца за мандаты з Гайнаўскага і Бельскага паветаў. Неўзабаве наступіць падзел еўрасаюзных сродкаў на 2007-2013 гады на рэгіянальны развой, а праз м.інш. ваяводскі самаўрад будзе рэалізавацца ўрадавая праграма развою Усходняй сцяны. Падзел гэтых сродкаў патрабуе прысутнасці беларускай грамадскасці, нашага лобі, якое будзе змагацца за грошы для гэтай часткі ваяводства, у якой пражывае большасць беларусаў. Справа ў тым, каб гэтая частка нашага рэгіёна не стала свайго роду Паўднёвай Амерыкай, каб не была рэгіёнам далёка бяднейшым за гэтыя, што на заходнім баку Віслы.

Надзея Артымовіч

Яўген Вапа адзначае:

— БВК — верны сваім прынцыпам. З 1990 г. заўжды былі беларускія выбарчыя камітэты. Хаця мелі мы прапановы з боку левых і правых, на гэтых выбарах мы не рашыліся на зблакіраванне нашых спіскаў з іншымі арганізацыямі ці групоўкамі або схавацца пад якімісь іншымі назвамі. Зблакіроўванне спіскаў — несур’ёзнае ў адносінах да выбаршчыкаў. Для мяне асабіста важным з’яўляецца тое, каб Белавежская пушча за наступныя 10 гадоў не аблясіла Гайнаўку і навакольныя вёскі. Людзі — яны перш за ўсё важныя на тэрыторыі гэтых Зялёных лёгкіх Польшчы!

Ганна Кандрацюк

Іншы кандыдат з гэтай акругі гісторык Славамір Іванюк кажа:

— Кандыдаванне ў Сеймік гэта абавязак дзеля беларускай грамадскасці, тут, на Беласточчыне. Ваяводскі сеймік распараджаецца агромнымі грашыма на культуру. З 1989-1990 гг. было гэта больш за дзесяць мільёнаў на год. Нашай беларускай культуры даставаліся дасюль з гэтай пулькі нэндзныя рэшткі. Я думаю, што наша беларуская культура вартая падтрымкі на значна большым узроўні.

Славамір Галёнка

Яўген Вапа

Стартуюць са спіска ў пятай акрузе яшчэ Ян Тапалянскі, Веслаў Харужы, Юзаф Ёдчык, Лукаш Плева і Славамір Галёнка.

Лукаш Плева, шэф Звязу беларускай моладзі:

— Мы мусім падкрэсліць, што і мы беларусы тут, у нашым рэгіёне, ёсць, тут нарадзіліся, адсюль мы родам і тут жывём. Беларусы не могуць быць толькі цярпімымі. Трэба ўсведамляць, што маем мы свае абавязкі, але таксама і свае грамадскія правы. Сваёй прысутнасцю ў Сеймікі хачу таксама разбудзіць самасвядомасць гэтых беларусаў, што не ведаюць аб сваіх каранях або іх саромяцца.

Славамір Іванюк

Славамір Галёнка, ініцыятар праекта „Краіна шчаслівасці” адзначае:

— Трагедыяй гэтага рэгіёна з’яўляецца факт, што вёскі, асабліва беларускія, пусцеюць. Трэба зрабіць усё, каб маладыя людзі згэтуль не ўцякалі. Маладому пакаленню трэба стварыць матэрыяльныя ўмовы і прышчапіць ім спадчыну нашых продкаў. Асабліва цяпер гэта важнае — у час глабалізацыі. Трэба вярнуцца да ідэі святліц, можа, напрыклад, у форме інтэрнэт-кафэ. Дзякуючы еўрасаюзным грошам у старэйшых людзях трэба зварухнуць іхнюю ўсыплёную актыўнасць.

Агулам у падляшскі Сеймік кандыдуе васемнаццаць прадстаўнікоў БВК.

Раіна СТЭФАНЧУК

Гісторыя аптэкі ў Гайнаўцы

У 1921-1923 гадах у Гайнаўцы асноўныя лякарствы, між іншым, аспірын, страўніковыя кроплі, каустычная сода ды перавязкі можна было купіць толькі ў адным фельчарскім пункце каля Дрэваапрацоўчага прадпрыемства дзяржаўных лясоў „Польскія лясы", які вёў фельчар медыцыны Уладыслаў Кшэўскі. У аптэку ездзілі ў Белавежу. Кіраваў ёю правізар фармацэўтыкі Людвік Вайткоўскі.

У Гайнаўцы першую аптэку адкрыў у 1925 годзе правізар фармацэўтыкі Адам Глінскі. Саўладальнікам яе быў правізар Вінцэнты Германоўскі. Ён меў аптэку ў Беластоку. Аптэка ў Гайнаўцы знаходзілася па вуліцы 3 Мая. У ёй працавалі Адам Глінскі, магістр фармацэўтыкі Зыгмунт Нужынскі і аптэкарскі памочнік Норберт Парыс.

У 1930 годзе ўладальнікамі аптэкі сталі магістр фармацэўтыкі Юрый Галашэўскі і Зыгмунт Нужынскі. Знаходзілася яна ў доме Юзэфа Савіцкага. Над фасаднымі дзвярыма знаходзіўся вялікі балкон, падпёрты дзвюма драўлянымі калонамі.

У 1932-1933 гадах пункт перавялі ў будынак братоў Андрэя і Пятра Закшэўскіх па вуліцы Тарговай (цяпер вул. кс. Верабея).

Пасля II сусветнай вайны да ліпеня 1967 года аптэка займала частку памяшканняў у будынку па вуліцы М. Бучка, 22. Нужынскі і Галашэўскі прыдбалі стыльную мэблю, якую запраектаваў мастак Болаз. Зрабілі яе ў Школе драўлянай прамысловасці ў Гайнаўцы.

Ад 17 верасня 1939 года да чэрвеня 1941 года кіраваў аптэкай Мэер Лінкоўскі. Юрыя Галашэўскага мабілізавалі ў 1939 годзе ў польскую армію. Зыгмунта Нужынскага савецкія ўлады вызвалілі з працы. Ён пастанавіў выехаць з Гайнаўкі і запланаваў уцёкі. Калі ехаў у Варшаву, яго затрымалі савецкія салдаты і пасадзілі ў турму, дзе неўзабаве памёр. Пахавалі яго на рымска-каталіцкіх могілках у Гайнаўцы.

Ад чэрвеня 1941 года аптэка належала да Пелагеі Нужынскай і Зофіі Галашэўскай, а загадвала ёю магістр фармацэўтыкі Зофія Фабіцкая.

17 студзеня 1951 года аптэку нацыяналізавалі. Да гэтай пары яе персанал складалі Юрый і Зофія Галашэўскія, Зофія Фабіцкая, Пелагея Нужынская, Вераніка Дудко і Зінаіда Лукашэвіч. Бухгалтарам быў Аляксей Зін (пазней стаў ён дырэктарам Гайнаўскіх прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасці).

З таго часу горад пачаў бурліва развівацца. Расло запатрабаванне на лекі. Зараз у Гайнаўцы дзейнічаюць прыватныя аптэкі і ПЗФ „Цэфарм". Знаходзяцца яны пры вуліцах: 3 Мая (тры аптэкі), Пілсудскага (дзве), Ліпавай (у бальніцы), Жэчнай і Баторыя (дзве).

(мох)

Бачу БАС...

Думаю БАС — бачу чорна-белыя здымкі, на іх барадатага Лёніка, Вапу, як нешта тлумачыць, размахваючы рукамі, на іншым Коля надзімае вусны. Ці не дзіўна, што бачу гэта якраз я? Замнога здымкаў я аглянула, пэўна зашмат расказаў чула, усё мяшаецца з сённяшнім днём. Часам чалавек адчувае, што лепш было б нарадзіцца пару гадоў раней, тады пэўна і зразумела б чаму мне сёння кажуць са своеасаблівай гарачкай пра невыдадзены нумар „Апошніх паведамленняў" ці пра тое, як „obywatele" адмаўлялі рэгістрацыі. Я кажу, што разумею, так мне здаецца, але чаму мне не разумець, паколькі і я хадзіла ў рэйды, толькі мы шукалі сябе па мабільніках, а не блукаючыся па палях суседніх вёсак. Атрасіны? Сёння гэта ж такое дзіцячае — лепш папіць піва ў нейкім клубе. А можа мы проста не ўмеем гуляць! Варта над гэтым задумацца, бо ўцякаючы ад цяжкіх тэм загубляемся ў грамадстве працы ды гульні. І як тут жыць?.. Інтэлектуальныя сустрэчы шчасліва здараюцца, але больш яны патрэбны, каб сабе пацвярджаць, што мы аб'яднаныя беларусы, але ў „Сустрэчы", здаецца, няма зашмат пра што пісаць...

Думаю БАС — бачу багаты архіў і адчуваю недахоп часу, каб усё прачытаць, у шафе схаваны і мой чатырохгадовы ўспамін, а часу таксама няма, каб навесці парадак. Хто калі думаў, што кавалак паперы будзе так важны і так жаданы, мабыць, толькі архівіст па характары. Ёсць адзін.

Думаю БАС — бачу вялікі лозунг „STRAJKUJEMY Z WAMI. BIAŁORUSCY STUDENCI UW". Ахвярнасць, салідарнасць... ідэальнасць? І мы пэўна пабаставалі б ахвотна. Толькі за каго? За што? За дэмакратыю ў Беларусі? Хочам — не хочам, не выпадае інакш, толькі сёння гэта ўжо не забастоўка, а пікет! Асталася нам салідарнасць з Беларуссю, так прынамсі відна, што мы тут ёсць, бо лёс беларусаў Беласточчыны агульна здаецца мала цікавым. А за разуменне баставаць сэнсу няма — зразумее той, хто захоча. Здарылася мне раз ісці ў дэманстрацыі незадаволенасці, калі хацелі нам, студэнтам, паменшыць камунікацыйныя льготы... было гэта ў Варшаве, дзе нараджаўся самы актыўны БАС, ішла я з палякамі, за транспартныя квіткі і так плацім больш...

Думаю БАС — бачу ўрочышча, легенду, а можа і нейкі міф, бо ім усё абрастае, можа гэта шчасліва, міф асацыюецца часта з казкай... Давайце распавяду вам казку пра добрых і злых, пра ўкрадзеную „сырэнку", пра шампанскае ды пледы на траве, можа нават пра музыку якая аб'ядноўвае, будуе масты і пра ідэі, якія разбураюць парадак краіны лагоднасці...

basovka

Студэнцкія атрасіны ў Варшаве ...

... і Беластоку

Студэнты вярталі гістарычную памяць ...

і спазнавалі сваю Бацькаўшчыну ў час вандровак

Архівы за архівы

Злева: Кшыштаф Талвінскі (віцэ-маршалак Падляшскага ваяводства), Вольга Бірукова, (намеснік старшыні Камітэта па справах архіваў і канцылярый пры Савеце Міністраў РБ), Анджэй Ляхоўскі (дырэктар Акруговага музея ў Беластоку)

Фотакопіі дакументаў падляшскіх земскіх і гродскіх кніг XV-XVIII стагоддзяў перадаў польскаму боку Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Гэты беспрэцэдэнтны акт быў учынены дакладна ў той момант, калі падляшскі ваявода прымаў старшыню непрызнаванага рэжымам Лукашэнкі Саюза палякаў Беларусі Анжаліку Борыс.

Гэтая першая частка копій са ста тысяч старонак-кадраў дакументаў на мікрафільмах вельмі ўрачыста была перададзена ў беластоцкім Падляшскім музеі. Іх арыгіналы вывезены былі расіянамі ў 1915 г. перад наступленнем нямецкіх войск. Пасля II вайны апынуліся яны ў Мінску. Сто тысяч зл. на іх капіроўку дала ўправа Падляшскага ваяводства. Узамен беларускі бок атрымаў мікрафільмы кніг з архіва роду Радзівілаў, якія знаходзяцца ў варшаўскім Архіве даўніх актаў (частка, якая месціцца на 250 метрах паліц шчыльна запоўненых дакументамі). Было гэта магчымым дзякуючы паразуменню паміж Польшчай і Беларуссю з пачатку дзевяностых гадоў аб доступе да архіўных матэрыялаў, абмене інфармацыяй аб сваіх зборах ды абмене публікацыямі і экспертамі.

— Незалежна ад палітычных неразбярых, супрацоўніцтва польскіх і беларускіх архіваў — актыўнае. Як аказваецца, спраўляемся з вырашаннем праблем супольнай нацыянальнай спадчыны, — запэўніваў Владыслаў Стэмпень, намеснік дырэктара ў варшаўскай Галоўнай дырэкцыі Дзяржаўных архіваў.

Анджэй Ляхоўскі, шэф Падляшскага музея, быў згодны:

— Першая Рэч Паспалітая — наша супольная маці. Мы стараліся здабыць гэтыя дакументы, каб Падляшскае ваяводства магло чэрпаць са свае гісторыі і тоеснасці.

Віцэ-маршалак Кшыштаф Талвінскі:

— Мы ў выглядзе запісаў кніг, а беларусы — архіваў роду Радзівілаў вяртаем сабе частку сваёй памяці.

Марэк Кетлінскі, дырэктар Дзяржаўнага архіва ў Беластоку, куды трапяць фотакопіі кніг, тлумачыў „Ніве":

— Гэтыя кнігі — спадчына часу І Рэчы Паспалітай і Падляшша. У мінскім архіве такіх кніг каля пяцісот. Паступова будзем здабываць наступныя копіі.

Пры нагодзе дырэктар не скрываў, што ў беларускіх архівах захоўваецца яшчэ шмат дакументаў, у якіх зацікаўлены польскі бок:

— Напрыклад, у Гродне ёсць вельмі цікавая дакументацыя начальніка Беластоцкай вобласці перыяду 1808-1842 гг. Гэтыя матэрыялы маюць капітальнае значэнне для гісторыі Беластока. Стаіць пытанне перагавораў з мэтай здабыць іх копіі. Напэўна няма гаворкі аб вяртанні арыгіналаў. Усё залежыць таксама ад магчымасці падтрымкі нашых мясцовых улад.

Перададзеныя цяпер беларускім бокам копіі судовых земскіх і гродскіх драгічынскіх, мельніцкіх ці бельскіх кніг (запісы аб спрэчках, акты пазык і куплі, шлюбныя акты і да т.п.) маюць запоўніць прабел у польскіх архівах і маглі б яны паслужыць хоць бы для напісання першай у гісторыі манаграфіі Падляшскага ваяводства, для прыкладу, з нагоды ягонага 500-годдзя ў 2013 годзе.

Вольга Бірукова, намеснік старшыні Камітэта па справах архіваў і канцылярый пры Савеце Міністраў РБ (у ранзе міністра) сказала:

— Прапанова польскага боку абменьвацца дакументамі трапіла да нас у снежні мінулага года. Напачатку прапанаваўся абмен мікрафільмамі, ды гэта немагчыма зрабіць з архіўных, надта тоўстых кніг, якія трэба было б расшываць. Мы падпісалі адпаведнае паразуменне паміж Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі і Галоўным архівам даўніх актаў у Варшаве. Дамова аб двухступеннай перадачы дакументаў мае абавязваць да 31 снежня 2007 г.

Дадала яна ў размове з „Нівай":

— Пералік дакументаў, якія мы хацелі б атрымаць ад польскага боку, вельмі доўгі. Аднак, не заўсёды нам хапае магчымасці на гэта. Несумненна, нам хацелася б, каб усе копіі цэлага архіва Радзівілаў вярнуліся на радзіму. А дакументы Радзівілаў знаходзяцца не толькі ў Польшчы. Частка з іх — на Літве, частка ў Нямеччыне, невялікая частка — у архівах Украіны. Мы не ў змозе купіць арыгіналы архіўных дакументаў з іншых краін. Там іх месца, куды яны трапілі на працягу гісторыі.

У кулуарных размовах з журналістамі Владыслаў Стэмпень дадаў:

— Вельмі вялікае значэнне для нас будуць мець літоўскія кнігі-метрыкі да часу Люблінскай уніі, якія знаходзяцца ў Маскве. Так як і беларусам, літоўцам, так і нам вельмі залежыць на інфармацыі, якая там змяшчаецца.

Губерт Вайс, дырэктар Галоўнага архіва даўніх актаў у Варшаве прыгадаў:

— Падляшскае ваяводства, якое ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага, на памежных землях і першапачаткова складалася з Бельскай, Драгічынскай, Камянецкай, Кобрынскай і Мельніцкай зямель. У 1520 г. кароль Жыгімонт I пацвердзіў заснаванне ваяводства; часта якраз гэтая дата лічыцца пачаткам ваяводства. Незалежна ад таго, межы ваяводства не былі дакладна вызначаныя.

Дадаў ён яшчэ:

— У той час Бельская зямля была найбольшай з трох зямель, якія стварылі гэтае ваяводства; дзялілася яна на тры судовыя паветы: Бельскі, Суражскі і Тыкоцінскі. Драгічынская і Мельніцкая землі не дзяліліся на паветы.

Спасылаючыся на архіў Радзівілаў, адзначыў:

— Асабліва гістарычнае значэнне маюць аддзелы, у якіх захоўваюцца акты датычныя публічнай дзейнасці Радзівілаў, у якіх сабрана дакументацыя аб дзейнасці сеймаў, сеймікаў, войска, аб замежнай палітыцы, скарбе.

Паінфармаваў прытым, што ў сабраных у Варшаве архівах роду Радзівілаў захоўваюцца таксама дакументы іншых сем'яў, м.інш. Сабескіх і Сапегаў.

Абмен копіямі архіўных дакументаў паміж Польшчай і Беларуссю будзе вялікай палёгкай у працы не толькі саміх архівістаў, але, здаецца, перш за ўсё гісторыкаў. І тыя, і другія мусілі, часам не без чыноўніцка-фармальных перашкод, службова выязджаць за мяжу і толькі на месцы аналізаваць дакументы.

Тэкст і фота Раіны СТЭФАНЧУК

Беларуская дэлегацыя наведала рэдакцыю „Нівы"

Яшчэ аб чыгунцы

У заслужанага карэспандэнта „Нівы" Уладзіміра Сідарука з-пад Чаромхі бачны дзве заганы: першая — што ён і мяне заразіў пісаннем у беларускі тыднёвік, намаўляючы зрабіць першы крок на гэтай ніве; другая — што ўвесь час чапляецца ён польскай чыгункі, якая а то замала цягнікоў устанавіла, а то ў вагонах сціск, а то брудныя пачакальні... А потым чакае з надзеяй, што нехта возьме да сэрца ягоную крытыку, адкажа яму і выправіць адмоўныя з'явы ў сваіх дзеяннях. Але ўсе Сідаруковыя заўвагі не надта дакладныя, невядома каму яны адрасаваны. Пісаць агульна „чыгунка" можна было пры камуне, бо цяпер настаў лепшы час і колішняя чыгунка папросту не існуе.

Напрыклад, вазьміце беластоцкую тэлефонную кніжку і паспрабуйце знайсці ў ёй нумар тэлефона паўстанка ў Сямятычах-Станцыі. Хутчэй пацалуеце сваю спіну, чым удасца вам патэлефанаваць! У афіцыйным спісе суполкі Польская тэлекамунікацыя знойдзем аж дзевяць чыгуначных фірмаў: PKP Cargo S.A.; PKP Cargo S.A. „Przewozy Regionalne" Sp. z o.o.; PKP Energetyka Sp. z o.o.; PKP Informatyka Sp. z o.o.; PKP Polskie Koleje Państwowe S.A.; PKP Polskie Linie Kolejowe S.A.; PKP Przewozy Regionalne Sp. z o.o.; PKP S.A.; PKP S.A. Polskie Linie Kolejowe.

Думаючы лагічна, цяпер на чыгунцы павінна быць у дзевяць разоў лепш, чым пры камуне. І да каго Вы, шаноўны Валодзя, канкрэтна напраўляеце свае прэтэнзіі? Ну, гэтага Вы ўжо не пішаце і тады невядома хто мае адгукнуцца на Вашу крытыку. Так сама як невядома які нумар тэлефона сямятыцкай станцыі, бо ніхто да яе не хоча прызнавацца. Зрэшты, нічога дзіўнага, паколькі гэта малая, занядбаная, малапрыбытковая станцыя і, відаць, таму ніхто яе не хоча.

І, пэўне, таму **Тэлекамунікацыя** польская таксама паставілася да яе абыякава.

М. Ц.

У Гайнаўцы

Цяпер у Гайнаўцы паставілі новыя каляровыя інфармацыйныя табліцы для турыстаў. Сустрэнем іх на вакзале ПКП і ПКС, пры Гайнаўскім доме культуры, побач скрыжавання вуліц 3 Мая і кс. Верабея, пры Гарадской управе ды ўязджаючы ў горад з боку Кляшчэль.

На табліцах абазначаныя галоўныя турыстычныя атракцыёны Гайнаўкі. Інфармацыі пададзеныя на польскай, беларускай і англійскай мовах.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 47 -

Кожны ў хаце павінен мець свой куточак, калі нават жывуць усе ў адным пакоі. Цяжка, пэўна, захаваць інтым у такім выпадку, ды кожны павінен мець сваю прыватную прастору, куды іншым без яго дазволу няма ўваходу. Гэта так як і з лістамі: паважаеш чалавека — ніколі не заглянеш у яго прыватны ліст, нават калі ты мама ці тата. Такі чалавечы закон. Дэмакратычны. Людскі.

— Ну, — падумаў Грак. — Людскі. Дык чаму Гражынка адчыніла мой майл у Трнаву? Праўда, выслаў я з яе пошты, бо ж свае тады яшчэ не меў. А так смяялася! Ну, і што з таго, што мне хацелася спытацца ў Алекса, якое надвор'е ў той Трнаве? А як жа ж пачаць размову? Пытаюцца пра надвор'е, настрой... „Як маешся?" — спытаўся я ў Алекса, а ён: „А, маюся, маюся па гэтым свеце". Хто пешшу маецца-туляецца, хто крылом час ад часу махне і здаецца яму, што жыве... А тут і схавацца няма куды. Захінешся заслонай, адразу шукаюць: „Грак, Грачок, дзе ты? Куды ты схаваўся? Ці не загразз зноў за шафай?!" Тая няшчасная бабуліна старадаўняя шафа, а хутчэй вузкая прастора паміж ёй і сцяной сніцца Граку ў найжахлівых кашмарах. Уявіце сябе дзюбай уніз, з прыціснутымі да бакоў крыламі, са здранцвелымі нагамі ўверсе, а ваш крык „р-р-р-ратунку-у" ледзь самі пачуеце?! Нуй схаваўся! Нуй інтым знайшоў! Засакрэціўся! Ледзь яго бабуля ўчула — яна, здаецца, чуе нават ультрагукі! — і дастала яго адтуль з дапамогай старажытнай качарэжкі, што стаіць ля камінка... Уффф!

У хаце цішыня, апрача Грака і Мікіткі, што сапе-пахрапвае ў сваім лазовым доміку — нікога няма. Шчоўкнуў Грак уключальнікам камп'ютэра, манітора, увайшоў у Інтэрнэт. Тут і Мікітка ўскочыў на стол.

— З кім ты будзеш лязмя-я-яўляць? Напісі ліст маёй мамцы!

— Не думаю, што ў твае мамкі ёсць доступ да камп'ютэра.

— На-а-а-пісі!!!

Грак падумаў, падумаў і ўклікнуў: murka@wp.pl.

—Дык што напісаць? Толькі без гэтых „мля-мля-мля".

— Пісі! Любая Мамка! Твой сіноцяк казя, сто тут яму добля. Плітуліця хацю да мамкі... Мя-я-яў...

Праз пару хвілін прыйшоў адказ: „Каханы Сыночку! Прытуляю цябе і цалую! Твая мамуля Тыгруля".

Міра ЛУКША

Дарагая Зорка!

Пішуць да Цябе вучні другога класа са школы ў Нараўцы. Мы хочам расказаць пра сябе, пра вучняў, якіх бацькі запісалі на ўрокі беларускай мовы. Мы ў будучыні будзем чытачамі „Зоркі".

У нашай групе 10 вучняў: Аня Недзведзь, Наталля Марчук, Паўліна Анішчук, Міхал Рубчэўскі, Міхал Стоцкі, Мікалай Бірыцкі, Давід Яцкевіч, Павел Валкавыцкі, Марэк Панькоўскі, Стэфан Харкевіч.

Усе дзяўчаткі вельмі добрыя і сумленныя вучаніцы. Аня любіць чытаць кніжкі і з бацькамі размаўляе па-беларуску. Наталля любіць гуляць у мяч, чытае кніжкі і з цікавасцю глядзіць фільмы. Паўліна часта дапамагае маме, асабліва тады, калі яна пячэ пірагі, дзяўчынка любіць глядзець прыгодніцкія фільмы і калекцыянуе каляровыя картачкі.

Хлопцы ў нашай групе вельмі вясёлыя і шустрыя. Стэфан любіць бегаць і скакаць, яго сябар Міхал Р. таксама ледзь усядзіць на ўроку, але вельмі любіць свайго ката. Павел апрача гульні з коцікам любіць праводзіць час, гуляючы ў футбол. Міхал С. у вольным часе іграе на камп'ютэры і гуляе на панадворку. Марэк і Мікалай цікавяцца футболам і даглядаюць сваіх коцікаў. Давід слухае музыку, гуляе ў футбол, любіць бегаць і скакаць, але найбольш цікавяць яго аўтамабільныя праграмы.

Вось якія вясёлыя вучні не баяцца тры разы ў тыдзень прыйсці на ўрок беларускай мовы!

Прывітанні ўсім другакласнікам!

Да пабачэння!

Ад рэдакцыі:

Дарагія сябры! Я прачытала ваш ліст і захапілася. Вы так цудоўна расказалі пра сябе і свой клас. „Зорка" заўсёды рада вітаць новых сяброў і чытачоў. Думаю, што з дапамогай бацькоў і настаўнікаў вы ўжо можаце рашаць нашы крыжаванкі (пры нагодзе — у рэдакцыі чакаюць узнагароды нараўчанскім школьнікам за мінулы год!) і збіраць файныя кніжкі, кампакт-дыскі, запісныя кніжкі, фламастэры, аўтаручкі, пакеты...

„Зорка" перадае прывітанні вашым бацькам і настаўнікам. Чакаем чарговых допісаў і лістоў ад нашых сімпатычных сяброў!

Ганна КАНДРАЦЮК

Пазнаем алфавіт

Літара „В"

Тэлеграма

Пасварыліся Міколка і Васілёк. Надзьмуліся. Адзін з адным не размаўляюць.

Прыйшла ў пакой мама, села за стол і на паперы напісала літарку „В".

— Хлопчыкі, якую літару я напісала? — пытаецца.

Зірнуў Міколка, сказаў:

— Літару „В".

А мама зноў піша: вакса.

— Вакса, — прачытаў Васілёк.

Прыжмурылася хітра мама:

— Цяпер паспрабуйце скласці тэлеграму.

— Тэлеграма — гэта пісьмовае паведамленне, — адзначыў Міколка.

— Кожнае слова нашай тэлеграмы павінна пачынацца з літар таго слова, якое я напісала, — сказала мама.

— З літар слова „вакса"? — пацікавіўся Міколка.

Малюнак Мухі Андрэя, 1 клас, гімназія № 1

— Гэтыя літары — „В", „А", „К", „С", „А", — удакладніў Васілёк.

— Правільна зразумелі, — прамовіла мама. — І яшчэ такое правіла запомніце: парадак літар нельга змяняць.

— Можна скласці смешную тэлеграму? — пытаецца Васілёк.

— Паспрабуйце, — кіўнула галавою мама.

Нялёгка скласці такую тэлеграму, каб кожнае яе слова пачыналася з літар таго слова, якое напісала мама, — вакса. Доўга сядзелі хлапчукі, крэслілі ручкамі паперу.

Нарэшце Міколка падаў голас:

— Я склаў. Паслухайце. Выязджаю. Аленка купіла сукенку. Антон.

— І я склаў, — кажа Васілёк. — Вы Аліку купіце сандалі. Ала.

Затым мама склала:

— Выязджайце. Арэнбург. Каця сустрэне. Алег.

А пасля Міколка і Васілёк сказалі:

— Волька адрэзала кавалак сала. Антон.

Смяюцца Міколка і Васілёк. Пра сварку зусім забыліся.

Хто з вас паспрабуе скласці тэлеграму з літар слова, якое пачытаецца з літары „В"?

(працяг будзе)

Аляксей ЯКІМОВІЧ

„Займальны алфавіт"

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— (4) —

Усё пачалося на першым уроку біялогіі, калі спадарыня Воўк прыйшла ў наш клас з нейкім хлапцом, якога я раней ніколі не бачыла.

— Гэта Міколка, — сказала яна, — з сённяшняга дня ён будзе ў вашым класе.

— Цікава, чаму нас сустрэў такі гонар, — гадалі мы ўголас і слушна знюхалі тут інтрыгу. Нехта паставіў падобнае пытанне дырэктарцы?

— Бо ён нідзе не можа вытрымаць больш трох дзён, — адказала з пэўным хваляваннем дырэктар, — у якую школу не пойдзе, адусюль яго гоняць. А ў нас, — спадарыня Воўк бездапаможна развяла рукамі, — няма выбару, ён мае тут прапіску.

Скажу праўду, я нават уцешылася, што нехта новы дайшоў у наш клас, можа будзе смяшней?!

— Сядзь з Басяй, — сказала Аўрэлія. — Яна сёння адна і ёй напэўна сумна.

— Добра-добра, — адказаў хлопец і прысеў да мяне.

У першы момант я злякалася:

— А раптам ён насваволіць і ўсё зноў будзе на мяне?!

На развітанне спадарыня Воўк сказала нешта такое:

— А вы, даражэнькія, будзеце яму добрым узорам. Ну *да пабачэння!*



Яна нават не паспела закрыць дзверы, як той Міколка стаў размаўляць з Ігарам. Праз наступныя хвіліны высветлілася, што яны пражываюць на той самай вуліцы. Аўрэлія ўвесь урок напамінала ім, каб перасталі гаварыць, але яны яе не слухалі. Гутарылі яшчэ галасней, як на нейкім базары. І, вядома, ужо на першым уроку Міколка зарабіў першую заўвагу ў вучнёўскі дзённік. Але хлапец гэтым зусім не пераняўся. На перапынку ён выкінуў цераз акно крэсла і кветку, якую захапіў на калідоры. Уся школа смяялася з яго выбрыкаў, але на ўроку матэматыкі жарты скончыліся. Калі спадарыня Іванчэўская, якая нас вучыць матэматыкі, пайшла ў прыбіральню, Міколка шмыгануў да дзвярэй і перакрунуў замок. Клас заліваўся смехам. Спадарыня Іванчэўская доўга грукацела ў дзверы, а пасля пайшла па дырэктарку. Да гэтага часу нехта адкрыў дзверы. Спадарыня Воўк нічога не сказала, толькі ўхапіла Міколку за вуха і павалакла за сабой у кабінет. Нам дасталіся „ўзнагароды" за калабарацыю з жулікаватым сябрам. Пад канец урока спадарыня Іванчэўская загрузіла нас дамашнімі задачамі.

Мы крыху апрытомнелі. Калі Міколка вярнуўся ў клас, усе маўчалі і ніхто не хацеў з ім гаварыць, хоць ніхто не мог перастаць пра яго думаць.

Я не ведала што думаць — столькі заўваг я не назбіраю за цэлы год — і цікава, колькі іх будзе ў Міколкі ў чэрвені? У першы дзень ён зарабіў пяць заўваг.

тэкст:<Natasza9922@wp.pl>
дызайн:<lolcia05@tlen.pl>

Галерэя „Зоркі" (Бельск-Падляшскі)

Барбара Карыцкая

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: 5,6.

Твая мянушка: Нямя мянушкі, усе завуць Бася, Баська.

У жыцці хачу стаць, чаму: Я хачу стаць ветэрынарам, таму што люблю ўсіх звяркоў (найбольш сабак). Калі ў мяне гэта не атрымаецца, дык стану я... спявачкай.

У сяброў цаню: Дабрыню, шчырасць, люблю тых, якім можна верыць. Добра, калі сябар любіць хоць крышку пасмяяцца, пажартаваць.

Не люблю: Я не люблю несімпатычных, няшчырых людзей. Не люблю таксама сумных сяброў, бо я вельмі вясёлая дзяўчына.

Па-беларуску размаўляю з: Настаўнікам беларускай мовы, з бацькамі, бабуляй і дзедкам, я вельмі люблю размаўляць па-беларуску.

Мой любімы гурт: Я люблю многа гуртоў беларускіх і польскіх, напрыклад, „Н.Р.М.", „Прымакі", „Mandaryna" і „Virgin".

Каля свайго дому пасаджу: Многа кветак (найбольш цюльпанаў, фіялак, ружаў і маргарытак), а таксама кусты чорнай парэчкі і зялёную траўку. Можа будуць расці яблыні і грушы.

Вершы Віктара Шведа

Яшчэ добра чую

З цела бруд змывае
У ваннай Паўлуша.
Матуля пытае:
— Ці памыў ты вушы?

Раптам чуе мама
Фразу вось такую:
— Я яшчэ вушамі
Вельмі добра чую.

Польска-беларуская крыжаванка № 45



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 41: Кропка, Ас, рой, вырай, ахова, паж, млын, баян, магчымасці, рак, аса, на, агляд, но, хутар, брат. Каша, нюх, хмара, Волга, прывычка, раны, ара, малы, ой, Бася, ай, пасад, заяц, на, сажні, кот.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Павел Дамброўскі, Сільвія Федарук, Кацярына Панькоўская, Кшыштаф Парфянюк, Іаанна Нявінская, Іаанна Марчук, Дам'ян Дэмбоўскі** і **Паўліна Зінкевіч** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

У міжнароднай кампаніі

Падвядзенне вынікаў рэалізацыі праекта ў рамках Міжнароднай бельскай міжкультурнай інтэграцыі, якое адбылося 21 кастрычніка ў Бельскім доме культуры, спалучанае было з выступленнем пераможцаў паасобных міжнародных конкурсаў і адкрыццём выстаўкі прац Міжнароднага жывапіснага пленэру. З дасягненнямі дзяцей і моладзі з Беласточчыны, Беларусі і Украіны маглі пазнаёміцца іх равеснікі, сямейнікі і наведвальнікі, што прыйшлі ў БДК.

— Упершыню мы ў Бельскім доме культуры наладзілі міжнароднае мерапрыемства такога вялікага маштабу, на рэалізацыю якога ўдалося прыдбаць каля 100 тысяч злотых, у галоўным еўрасаюзных сродкаў. Паасобныя конкурсы і жывапісны пленэр, якія мелі міжкультурны характар, ладзілі мы раней. Аднак першы раз набылі яны міжнародны статус, — заявіў дырэктар БДК Сяргей Лукашук. — Шкада толькі, што па незалежных ад нас прычынах не даехала частка моладзі з Беларусі. Зараз цяжка высветліць, хто вінаваты, але спадзяемся, што ў наступным годзе не будзе праблем з прыездам вучняў з Рэспублікі Беларусь.

Завяршальнае мерапрыемства, якое паказвала, як праходзіла рэалізацыя праекта (з вясны гэтага года), распачалося з прэзентацыі фотаздымкаў — плёну Міжнароднага жывапіснага пленэру, які ў чэрвені праходзіў у Бельску-Падляшскім і яго наваколлі. Сабраныя маглі ўбачыць месцы, якія на Бельшчыне наведалі ўдзельнікі пленэру і варштат іх творчай работы. На пасляпленэрнай выстаўцы, якой адкрыццё адбылося ў БДК, можна было ўбачыць акварэльныя, пастэльныя і алейныя работы. Побач карцін з бельскімі цэрквамі і касцёламі ў выставачнай зале знаходзяцца працы з прыгожымі краявідамі, заўважанымі моладдзю ў наваколлі Бельска.

— Важнай справай у час міжнароднага пленэру было азнаямленне моладзі з гісторыяй, архітэктурай і традыцыямі нашага рэгіёна. Пленэр спрычыніўся да фармавання эстэтычных і творчых адносін вучняў да акружаючага свету, — кажа інструктар па мастацкай дзейнасці ў БДК і каардынатар пленэру Марыя Бабулевіч. — Сустрэчы з новымі людзьмі справа карысная і прыемная. Асабліва тады, калі гэтыя людзі нам блізкія, калі яны сябры, і спалучаюць нас супольныя творчыя зацікаўленні.

VII выпуск Дэкламатарскага конкурсу „Паэтычнае трохгалоссе", які адбыўся 20 кастрычніка ў БДК, таксама быў пашыраны на ўдзельнікаў з Беларусі і Украіны. Сярод пяцідзесяці дэкламатараў, якія прэзентавалі творы на беларускай, польскай і ўкраінскай мовах, было некалькі асоб, што выступілі на рускай мове. Рыхтуючыся да конкурсу ў наступным годзе, арганізатары мусяць задумацца ці памяняць яго назву на чатырохгалоссе, ці абмежаваць мастацкае чытанне на адной з моў.

— Узровень дэкламацыі з кожным годам павышаецца. Цешыць нас, што ў гэтым годзе апекуны вучняў трапна падабралі рэпертуар да ўзросту і дэкламатарскіх магчымасцей дзетак і моладзі, а прэзентаваныя вершы былі вельмі разнароднымі. Нават не арганізавалі мы майстар-класаў па правільнай дэкламацыі, — кажа старшыня конкурснай камісіі Ева Якубашак з Ваяводскага асяродка анімацыі культуры, якая ад пачатку працуе ў журы конкурсу „Паэтычнае трохгалоссе". — Спачатку трэба было вырашыць як ацэньваць дэкламатараў з Беларусі і Украіны, прэзентуючых іншую ад нашай школу дэкламацыі. Нашы госці з-за ўсходняй мяжы звяртаюць вялікую ўвагу на жэсты і іх выступленні пераўтвараюцца ў тэатр аднаго акцёра. У Польшчы самае важнае слова, якім мы малюем усю карціну дэкламаванага твора. Аднак мы выпрацавалі супольныя крытэрыі і паводле іх ацэньвалі.

Юліянна Дораш з „тройкі", узнагароджаная Гран-пры, раней перамагала ў дэкламатарскіх конкурсах беларускай песні і ўдала выступала ў „Антракце"

Лепшыя дэкламатары выступілі ў час завяршальнага мерапрыемства. Сярод іх былі вучні Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы імя Яраслава Кастыцэвіча ў Бельску-Падляшскім. Найвышэй камісія ацаніла выступленне Аляксандры Лажэцкай з „тройкі" і для яе прысудзіла ўзнагароду Гран-пры. У катэгорыі вучняў IV-VI класаў пераможцам стаў Рыгор Бужынскі з Комплексу школ імя Адама Міцкевіча ў Бельску. Іншыя ўзнагароды атрымалі вучні з Беларусі, Украіны і бельскай „тройкі", а вылучэнні размеркаваны былі ўжо ў розныя школы Бельска.

— Я люблю чытаць па-беларуску байкі, — кажа Альжбета Крывіцкая з Гродна, якая выступіла з творам Пімена Панчанкі „Родная мова". — Калі б усе ў Беларусі гаварылі на беларускай мове, лягчэй было б вучыцца ў школе па-беларуску.

— Я ахвотна чытаю па-беларуску народныя расказы, — гаворыць Рыгор Трафімец з Гродна, які вельмі ўдала дэкламаваў верш Кандрата Крапівы „Дыпламаваны баран".

Узнагароду Гран-пры сярод гімназістаў атрымала Юліянна Дораш з „тройкі".

— Я ўжо шосты раз прымаю ўдзел у конкурсе „Паэтычнае трохгалоссе". Ад другога класа падставовай школы выступаю ў дэкламатарскіх конкурсах „Роднае слова" і ад трэцяга класа займаюся ў тэатральным калектыве „Антракт" пры БДК, — пералічвае Юліянна Дораш, пераможца шматлікіх конкурсаў. — На іх можна паглядзець на дэкламацыю іншых, падвучыцца ў іх і на наступны раз выступіць яшчэ лепш. У тэатральным калектыве я магу ўвасабляцца ў розных герояў і перажываць за іх. У час прэзентацыі абрадавых сцэнак можна вяртацца да нашых традыцый, даведацца, як калісь жылося і паказаць гэта іншым.

Калектыў „Антракт", у якім займаецца Юліянна Дораш паказаў фрагменты жніўнага абраду. З гэтай праграмай выступаў ён у час Міжнародных тэатральна-абрадавых майстар-класаў „Мая і твая спадчына", якія праходзілі ў жніўні гэтага года ў Студзіводах у рамках міжкультурнай інтэграцыі. З калектыву „Зязюленька" з Меднянскай сярэдняй школы (побач Брэста), які быў удзельнікам гэтых заняткаў, прыехаў вучань Барыс Хівук і выступаў з бельскай моладдзю.

— Наша моладзь з калектыву „Антракт" ахвотна вучылася ад вучняў з Беларусі старым народным танцам, якія ў нас ужо прызабытыя, — кажа Альжбета Фіёнік, — каардынатар тэатральна-абрадавага праекта.

У завяршальным канцэрце выступілі таксама лепшыя выканаўцы Міжнароднага фестывалю песні „Падляшская нота 2006". Сярод іх былі, між іншым, „Журавінка" з „тройкі" і выканаўцы з Ліды (Беларусь) — дуэт Анастасія і Алена Каралёвы і Вераніка Слаўта. Летам у доме культуры ў рамках праекта праходзілі два танцавальныя турніры і таму ў час канцэрта можна было паглядзець таксама маладых танцораў.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Пераможцы ў катэгорыі IV-VI класаў; злева: Альжбета Крывіцкая (Гродна) і Рыгор Бужынскі (трымае саву)

Калектыў „Антракт" (злева: Юліянна Дораш) выступіў са жніўным абрадам

Як абразы бачу перад вачыма

(пачатак у 44 н-ры)

З **Івонкай СУРВІЛАЙ**, старшынёй Рады БНР, гутарыць **Ганна КАНДРАЦЮК**.

— Памятаеце, як выглядаў той чалавек, які выратаваў Вашу сям'ю ад гібелі?

— Ён быў у мундзіры, мабыць, гэта быў нямецкі афіцэр...

— Куды прыплыў Ваш карабель?

— Мы дабраліся да паўвострава Гэль. Там мы былі таксама ўвесь час пад бомбамі, мама сядзела пад сталом, бо сцены сыпаліся проста на нас. Мы чакалі. Там усё бамбілі караблі, якія на нашых вачах тапіліся, але тата не кідаў веры, што мы выбярэмся з гэтага пекла. Ён хацеў ужо нават звязваць па некалькі галінаў дзерава, зрабіць плыт і кінуцца з сям'ёй на мора. Уяўляеце такое?

— Выратавала надзея?

— У адзін пахмурны дзень мы прыйшлі да порта, дзе чакалі тысячы людзей. Усе яны, так як і мы, мелі надзею папасці на нейкі карабель. Там стаялі два караблі, адзін ад Чырвонага крыжа, дзе знаходзіліся параненыя салдаты, а другі для жанчын і дзяцей. Вакол нас было яшчэ некалькі малых караблёў, задачай якіх было ахоўваць гэтыя два вялікія. Для нас, безумоўна, было немагчымым папасці на нішто. Лагічна не было шанцу. Мы не мелі ніякіх папераў, грошай, нічога...

— Ці нехта ў сям'і ведаў нямецкую мову?

— Не, не ведалі.

— Тады што адбылося?

— Так неяк сталася, што мама ўвайшла на кладку, што вяла да лодачкі, якая перавозіла на вялікі карабель. Мама пайшла па той кладцы з дзіцяткам на руках, а мы ўсе за ёй... І, ведаеце, чамусьці ўсе салдаты, якія там стаялі, ёй салютавалі. Можа таму, што мама была элегантнай жанчынай, прыгожа апраналася. Праўда, мы былі абарваныя, але ў мамы было чорнае элегантнае паліто, такая стройная поза. Тата пасля меркаваў, што, мабыць, яны падумалі, што яна немка, якой муж загінуў на вайне, а тата — яе парабак і ёй толькі дапамагае. Ён быў у беларускім кажушку. Вось якім спосабам мы патрапілі на карабель...

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

— ... які плыў у Данію?

— Быў яшчэ такі выпадак — у той час савецкія падводныя лодкі пускалі супраць караблёў тарпеды, у тым ліку і супраць таго карабля, дзе былі жанчыны і дзеці. У катастрофе загінула тысяча пяцьсот жанчын і дзяцей. Мы чамусьці апынуліся на караблі, дзе былі раненыя вайскоўцы, і шчасліва даплылі да Даніі.

— Як выглядала Данія пасля вайны?

— Яна была перапоўненая бежанцамі, было столькі ўцекачоў, што датчане не ведалі што з намі рабіць. Мы апынуліся ў вельмі дрэнных умовах. Жылі мы ў бежанскім лагеры, там памерла мая сястрычка. Яе не магчыма было ўжо выратаваць, так што там працягвалася наша бяда.

Пасля мы пераехалі ў іншы лагер для ўцекачоў і тады пачалі адчуваць сябе як у нармальнай краіне. Значыцца, людзі да нас добра адносіліся, я набыла сабе прыяцеляў, з якімі яшчэ цяпер трымаю кантакт. Наогул, пачалося даволі нармальнае жыццё. Тое, што мы жылі ў адным пакоі, разам дзве сям'і — гэта не было важным. Важнае тое, што мы перасталі баяцца за нашае жыццё. Раней мы дасведчылі, што жыццё можа трываць адну секунду. Тады пачалося нармальнае. Я, мабыць таму, не страціла свайго вечнага аптымізму.

— Хадзілі Вы там у школу?

— Спачатку, шэсць месяцаў я хадзіла ў польскую школу. У лагеры большасць складалі палякі, яны адразу адкрылі сваю школу. Пасля ўзяла мяне да сябе адна дацкая сям'я.

Гэта таксама свайго роду шчаслівы выпадак. Аднойчы я лётала па вуліцы і спынілася перад крамай ды заглядзелася ў выставачнае акно. Там усялякія каралі ляжалі. Я глядзела на іх і захаплялася. Маленькая была, дзевяць годзікаў мне было. І да мяне выйшла жанчына, уласніца гэтай крамы ды кажа: „Хто ты ёсць?" Я адказала ёй, што не разумею па-дацку. Яна: „А чаму?" Я кажу што не ўмею, бо мы з бежанцаў.

— А ты хочаш, каб я цябе навучыла па-дацку?

Я кажу: „Так".

— То прыходзь кожны дзень пасля абеду, я цябе буду вучыць.

І я хадзіла да гэтай жанчыны. Аднойчы прыехала да яе матка адведаць і яна папрасіла маці, каб тая ўзяла мяне да сябе, у дацкую сям'ю. Там я хадзіла ў дацкую школу. Адзін месяц, другі месяц, яшчэ і лета там пабыла. Як вярнулася дадому, у лагер, умела ўжо гаварыць па-дацку. Ад таго моманту я магла хадзіць у дацкую школу. Гэта не была такая простая справа — у лагеры я была адзіным дзіцём, якое ўмела размаўляць па-дацку.

Так што я хадзіла ў дацкую школу і там здала экзамены ў першы клас гімназіі.

Пасля мы выехалі ў Францыю і я стала вывучаць французскую мову.

— Якая замежная мова для Вас, будучай мастачкі і лінгвісткі, была першай?

— Першай была польская, пасля дацкая, французская... У Даніі, калі мы жылі ў лагеры разам з людзьмі іншых нацыянальнасцей, дык я дастаткова навучылася па-нямецку. Нямецкую вывучала я ў гімназіі, ужо ў Францыі. Гэта мне лёгка давалася. Вось праз першыя пяць гадоў школы я вучылася на пяці мовах.

— А як Вы навучыліся іспанскай?

— Іспанскай навучылася, калі выйшла замуж. Мой будучы муж паехаў вучыцца ў Іспанію. Мы пазнаёміліся ў Парыжы, яшчэ як я малая была. Я ім захаплялася моцна, ён быў разумны і прыгожы. Мы перапісваліся. Калі я закончыла універсітэт, паехала ў Іспанію і мы там пажаніліся.

(працяг будзе)

Ганна КАНДРАЦЮК

І зноў перастройка

Сацыялізм савецкага тыпу, канешне, поўнасцю вычарпаў свае жыватворныя магчымасці і таму амаль бясследна адышоў у нябыт. Тэарэтычна, канешне, ён мог яшчэ трымацца, а вось на практыцы пачаў здаваць і здаваць свае пазіцыі. І памёр не геройскай смерцю, заслужыў на гэта. У нас у Польшчы, на шчасце, тыпова савецкага сацыялізму, канешне, не было...

На змену яму зноў вяртаецца капіталізм. Хаця капіталізм таксама не святоша, а драпежная і бязлітасная структура. Праўда, даваў ён і надалей дае многім жыццёвы шанц. Але колькі ж ён патаптаў, знішчыў? І яшчэ знішчыць?!

Цяпер ён быццам ужо іншы, з людскім тварам, як кажуць. Але нараджаўся і рос са звярыным мурлом. Хто не верыць, няхай паштудзіруе гісторыю, адпаведную літаратуру ды са старэйшымі людзьмі пагаворыць...

У чым жа справа, што капіталізм у свой час пачаў ачалавечвацца, набываць людскі твар? Ці сам з сябе рабіў гэта, ці былі іншыя прычыны?

Канешне, не сам з сябе. Такой прычынай, якая змушала капіталістычны строй ачалавечвацца — была Вялікая Кастрычніцкая Сацыялістычная Рэвалюцыя. (Падаю поўную назву, бо можа ўжо хто забыў яе).

Для Расіі яна была вялікім няшчасцем. Для сацыялістычнага лагера, пазней, таксама злом. А вось для рабочага класа заходніх краін была вялікім дабрадзействам. У агульным разліку не страцілі на ёй і заходнія капіталісты. І ў тым менавіта заключаецца асноўная станоўчая заслуга Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Значыць, гэта яны, заходнія краіны, павінны ставіць у сябе помнікі Уладзіміру Ільічу, Іосіфу Вісарыёнавічу, нашаму Феліксу Эдмундавічу і многім іншым важакам пралетарыяту.

Справа ў тым, што ў час гэтай рэвалюцыі і пасля ўзнікнення савецкай дзяржавы пачалі хутка развівацца і пашырацца ў свеце рэвалюцыйныя ідэі, барацьба пралетарыяту за свае правы. Пралетарыят нарэшце паверыў у сваю сілу і магчымасць перамогі. Ды і маладая савецкая дзяржава не драмала, а актыўна дапамагала ўсім такім бунтарам...

Усё гэта смяротна пужала капіталістаў-імперыялістаў. Яны проста не былі пэўны свайго лёсу і лёсу нажытага капіталу. Ад адных толькі імёнаў згаданых мною важакоў савецкай дзяржавы ім ад страху валасы дыбам ставалі на галаве. Бо што тварылася з такімі як яны ў савецкай дзяржаве, яны добра ведалі.

І вось таму, каб не дапусціць рэвалюцыі ў сябе, яны пачалі ад страху ісці свайму рабочаму класу на ўступкі: скарачалі працоўны дзень, лепей аплачвалі працу, дазвалялі рабочым арганізаваць прафсаюзы, узаконьвалі іншыя выгады і льготы. Усё гэта дало добрыя рэзультаты — выйгралі рабочыя і не прайгралі капіталісты...

А ў тым часе савецкую дзяржаву камуністычнае кіраўніцтва, сваёй неразумнай палітыкай, нішчыла, нішчыла... і само знішчылася...

Ці ж не заслужылі камуністычныя важакі, каб на галоўных плошчах заходніх гарадоў паставіць ім помнікі?!.

Купіць іх можна ўжо гатовымі, нядорага і ў любой канфігурацыі... Дзе?!

У Польшчы не, бо ўжо прадалі, аддалі ці парэзалі на металалом.

Аляксандр Рыгоравіч не прадасць, бо лічыць, што ў Беларусі іх і так замала. Вунь як адпічкалі там сядзібу і помнік крываваму Феліксу. Відаць, дзеля паломнікаў. І слушна, толькі пазайздросціць Феліксу, як ён распраўляўся з апазіцыяй. Ой, як бы прыдаўся такі Фелікс цяпер...

Наш прыяцель Саакашвілі таксама не прадасць. Там Сталіны, Берыі — надалей куміры. І таксама правільна. Будзь яны жывымі цяпер, не мела б Грузія такіх клопатаў, як мае. Мела б надалей багатых спонсараў, як калісь. І была б надалей дзяржавай у дзяржаве ды прырастала б новымі тэрыторыямі...

Найвыгадней, думаю, набыць помнікі ў Расіі. Там іх прададуць і выбар вялікі. А калі легальна не прададуць, то трэба дагаварыцца з адпаведнымі структурамі — і яны за долары ці еўра самі прывязуць і паставяць там, дзе трэба...

Васіль САКОЎСКІ

http://belmov.org

Вядома, што мноства беларусаў пакінула Радзіму. Сярод іх далёка не ўсе такія, якія папросту не змаглі сябе зрэалізаваць на родных абшарах. Таму веды і вопыт ім прыходзіцца аддаваць іншым краінам, якія больш сур'ёзна ставяцца да такіх звычайных у цяперашнім цывілізаваным свеце паняццяў як дэмакратыя і правы чалавека. Адной з такіх краін, з найбуйнейшай эканомікай у свеце, з'яўляюцца Злучаныя Штаты Амерыкі. Аб некаторай частцы беларускай дыяспары там, а дакладней аб яе віртуальна-інтэрнэтнай дзейнасці, пойдзе сёння гаворка.

Сайт „Беларускага моладзевага руху Амерыкі" месціцца па адрасе http://belmov.org. Першая старонка сайта выглядае даволі просценька, але з густам. „Пагоня" з левага боку на фоне бел-чырвона-белага сцяга, які затым пераходзіць у зорна-паласатае палотнішча, адразу прыцягвае да сябе ўвагу такой цікавай мастацкай знаходкай. Ніжэй падаецца назва сайта на дзвюх мовах — беларускай і англійскай. Дарэчы, і сам сайт — двухмоўны.

Ніжэй на першай старонцы ідуць апошнія навіны і паведамленні, якія, на думку стваральнікаў сайта, мусяць быць найбольш цікавымі для яго наведвальнікаў. Праўда, тут прысутнічае звычайны недахоп падобных інфармацыйных дыяспарскіх парталаў — навіны абнаўляюцца не надта аператыўна.

Выйсці да рубрык, якія месцяцца з левага боку выяўлення, не ўражваюць сваёй шматлікасцю. Але на інфармацыйнасці гэта не адбіваецца. Па ўсім відаць, што актывістаў беларускага моладзевага руху Амерыкі не вабіць шматслоўе і яны аддаюць перавагу лаканічнасці. Сцісла і даступна ў рубрыцы „Пра нас" падаюцца мэты арганізацыі: „1. З'яднанне і падтрымка беларускай моладзі ў ЗША. 2. Адраджэнне беларускай мовы і культуры (выданне газет і кніг, арганізацыя і правядзенне выстаў беларускіх мастакоў, усталяванне помнікаў вядомым беларусам). 3. Усеагульная падтрымка беларускіх няўрадавых арганізацый. 4. Распаўсюджванне праўдзівай інфармацыі аб жыцці беларусаў свету. 5. Спрыянне развіццю дэмакратыі і правоў чалавека на Беларусі".

Наступная старонка „Нашы ініцыятывы" распавядае пра тое, што робіцца альбо ўжо зроблена сябрамі эміграцкай суполкі. З большага гэта праца ў Інтэрнэце. „Моладзевы рух" стварыў шэраг сайтаў некаторых выданняў і арганізацый. Аб іх у недалёкай будучыні магчыма пойдзе расповед на старонках „Нівы". Адной з галоўных і важкіх зрэалізаваных ініцыятыў „Моладзевага руху" можна назваць прапанаваную паслугу — бясплатны хостынг для беларускамоўных сайтаў.

Рубрыкі „Далучыцца" і „Кантакт" мала чым адрозніваюцца адна ад адной. Калі ў першай прапаноўваецца, пры жаданні супрацоўніцтва, распавесці крыху аб сабе і спосабах магчымай дапамогі арганізацыі, то ў другой маюцца вокны, куды трэба ўпісаць сваё імя, прозвішча і адрас электроннай пошты. Стасункі такім чынам наладжваеш з безасабовым адміністратарам рэсурса. Здаецца, што актывістам арганізацыі можна было б сябе абазначыць больш канкрэтна.

Нядрэннай рубрыкай з'яўляюцца „Спасылкі". Там месцяцца выйсці на шэраг беларускіх сайтаў, пра частку з якіх ужо пісала „Ніва".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Падвяла папярэчына

Чэмпіянат свету па спартовай гімнастыцы, што прайшоў у дацкім Орхусе, прынёс беларускай дружыне толькі адзін медаль — срэбра ў апорным скачку здабыў Дзмітрый Каспяровіч. Бывалі і куды больш важкія дасягненні. Так у 2001 годзе ў Бельгіі Беларусь была чэмпіёнам у агульным заліку. Тым не менш, сёлетні выступ мужчынскай каманды, якую па-ранейшаму трэніруе Віктар Дойлідаў (нядаўна ён адзначыў 50-гадовы юбілей) на радзіме казачніка Андэрсена можна ацаніць станоўчай адзнакай. Выходзячы яшчэ і з таго, што ў гэтым чэмпіянаце, па прызнанні спецыялістаў, узялі ўдзел практычна ўсе мацнейшыя гімнасты планеты.

Пасля двух дзён спабору ў камандавым фінале нашы хлопцы крыху сенсацыйна пасля першых двух відаў (апорны скачок і практыкаванні на брусах) былі лідэрамі. Трэба зазначыць, што ў кожным відзе ад краіны з шасці заяўленых выступаюць па тры гімнасты, а ўсе іх балы ідуць у агульны залік. Дык вось у трэцім „заходзе" беларусаў падвяла папярэчына, адзін з самых складаных гімнастычных снарадаў. Дэбютант топ-турніру Аляксандр Царэвіч не справіўся з хваляваннем і ўпаў. І хоць ветэран Іван Іванкоў адпрацаваў на папярэчыне амаль бездакорна, нашы зваліліся на сёмае месца. Далей яны не апусцілі рукі і змагаліся да апошняга (той жа Царэвіч выдатна „адскакаў" на кані). У агульным выніку Беларусь заняла 5-е месца. У прызёрах жа апынуліся Кітай, Расія і Японія.

У шматбор'і Беларусь прадстаўляў толькі Дзмітрый Савіцкі. Цікава, што там выступаў яшчэ адзін наш суайчыннік — Уладзімір Арцем'еў, які бароніць цяпер гонар амерыканскага сцяга. Савіцкі спачатку ішоў на медаль, але зноў „спатыкнуўся" у трэцім відзе — якраз на турніку. У выніку толькі 11-е месца, што для гомельца стала пэўным расчараваннем, хоць і выступаў ён з недалечанай траўмай. Што ж датычыць Арцем'ева, то ён, упаўшы некалькі разоў, заняў толькі 22-ю пазіцыю.

Заставалася надзея на асобныя снарады ў апошні дзень. Поспех Каспяровіча не стаў нечаканасцю — у скачку ўраджэнец Мінска быў чэмпіёнам кантынента яшчэ ў 2002 годзе. Зараз ён быў таксама ў ліку фаварытаў, што і пацвердзіў сваім выступам. А вось славутаму Іванкову, кар'ера якога ўсё доўжыцца, зноў не пашанцавала. Іванкоў прэтэндаваў на медаль у практыкаванні на кольцах, але суддзі адвялі яму (спартовая гімнастыка адзін з самых суб'ектыўных відаў спорту) толькі пятую пазіцыю. Такі ж вынік двухразовы абсалютны чэмпіён свету паказаў і на брусах, адчайна змагаючыся з плоймай азіятаў. Пэўнай маральнай кампенсацыяй Іванкову стала прызнанне самым элегантным гімнастам першынства. Гэта дадатковы тытул у калекцыі прызнанага майстра.

Сказаць што-небудзь станоўчае ў дачыненні да жаночай нацыянальнай дружыны не даводзіцца. У кваліфікацыі беларускі занялі толькі 24-е месца, а лепшая з нашых дзяўчат па суме чатырох відаў была толькі 69-й. Гэта яшчэ раз пацвярджае глыбокі заняпад у айчыннай жаночай гімнастыцы. А якія імёны былі ў гісторыі — Тамара Лазаковіч, Алена Ваўчэцкая, Вольга Корбут, Нэлі Кім, Святлана Багінская...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Была вайна

Калі маю душу апаноўвае жаласлівая, трывожная туга, іду на ваенныя могілкі ў Гайнаўцы. Ад майго дома да вайсковай некраполіі ўсяго пяць мінут хады. Цягне мяне сюды з неймавернай сілаю, мабыць таму, што пакояцца тут маладыя людзі, найвялікшы гонар іх айчын. Абыходжу могілкі. Многа тут ляжыць савецкіх салдат і партызан, радавых і афіцэраў, герояў Савецкага Саюза. Пахаваных тут 220 чалавек. На помніках захаваліся прозвішчы: Барысенка Ірына, Фларэнка Аляксей, Івановіч Якуб, Капусцін Сцяпан, Карнішын Васілій і многа, многа іншых.

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Могілкі савецкіх салдат і партызан у Гайнаўцы

Гляджу на літары высечаныя на надмагільных плітах і душа плача... Паціху, з болем сэрца іду далей. З сасонкі даносіцца прывітны голас птушчакі, якая, павярнуўшы зграбную галоўку, сваю песню паслала ў мой бок. Хваля ўдзячнасці ледзь мяне не захлынае.

Ускладаю палявыя і лясныя кветкі ля цёмна-шэрага помніка, пахіляюся ў нізкім паклоне над магіламі. Паволі ўздымаю вочы ўгару, здароўкаюся — прыкладаю руку да абеліска.

Вакол ціш, народу зусім няма. Нядзельны вячэрні час. На ясным небе загараюцца зоркі, ззяюць рознакаляровымі агеньчыкамі, пераліваюцца. Колькі часу гэтым маладым салдатам яны свяцілі? — разважаў я. Іх пакаленне даўно сышло з твару зямлі. Вецер развейвае магілы, разносіць прах загінуўшых. А душы? Няўжо яны не лунаюць дзе-небудзь, азараныя ясным, дзівосным святлом і не пасылаюць нам свае разумныя, чароўныя сігналы? Няўжо ўсё — прах і тлен, а чалавечае „я" прападае бясследна? Навошта тады так цярпліва ўзгадоўваць яго, берагчы і песціць? Навошта тады ўвогуле ўсё...? Чалавечая думка, пэўне, шукае ісціны да апошняга імгнення, да апошняга ўздыху.

Вяртаюся дамоў. Нейкі лёгкі сум ахінае цяпер мяне. Восенню на ваенных могілках адчуваецца асаблівая сіратлівасць. Халадок сумнення закрадваецца ў душу, пранікае да самога сэрца, калі ўсведамляю, што помнікі, так як і людзі, маюць свае жыцці і лёсы, абумоўленыя палітычнымі рэаліямі. Адным выпадае на долю добры дагляд і ўвага, вакол іх ладзяцца ўрачыстасці, чытаюцца ўзнёслыя прамовы, спяваюцца песні і ўскладаюцца кветкі. Іншыя разбураюцца людзьмі або прыродай, гінуць у забыцці.

Мінулі тыя часы, калі ля помніка савецкім воінам і партызанам у Гайнаўцы іграў завадскі духавы аркестр, а ганаровая варта Войска Польскага давала салют у гонар загінуўшых і рабіла пераклічку. Сёння ў Гайнаўцы гэты рытуал забыты. Шкада!

Аднак жыхары горада Гайнаўкі, школьная моладзь і камунальныя службы сочаць за парадкам на ваенных магілах. Няхай назаўжды будзе лёгкай вам, салдаты і партызаны, Гайнаўская зямля, з якой ужо ніхто і ніколі вас не разлучыць!

Віктар БУРА

Мемарыяльная дошка Гасану Канапацкаму

Сын Гасана Канапацкага, Мацей, дае інтэрв'ю тэлебачанню

25 верасня г.г. у Быдгашчы на будынку па вуліцы Мазавецкай 11 была адкрыта мемарыяльная дошка, прысвечаная Гасану Канапацкаму. Надпіс на польскай мове паведамляе, што „ў гэтым доме ў 1947-1953 гадах жыў палкоўнік Гасан Канапацкі (1879-1953). Указам начальніка дзяржавы Юзэфа Пілсудскага быў ён прызначаны камандзірам беларускага войска, якім заставаўся з кастрычніка 1919 г. да красавіка 1920 г."

Палкоўнік артылерыі Гасан Канапацкі нарадзіўся 25 лютага 1879 г. у Мінску ў татарскай сям'і. Закончыў Корпус кадэтаў у Полацку і Артылерыйскую школу ў Санкт-Пецярбургу. Удзельнічаў у руска-японскай вайне, а ў час I сусветнай вайны далучыўся да беларускага нацыянальнага руху, быў членам Беларускай вайсковай камісіі, а з 1919 года камандаваў беларускім войскам. З 1921 года жыў у Вільні, дзе м.інш. быў сакратаром Беларускага грамадзянскага сабрання, а потым намеснікам старшыні Беларускай часовай рады. У 1927-1928 гг. узначальваў рэдакцыю часопіса „Беларускі радны", а ў час выбарчай кампаніі ў Сейм і Сенат у 1928 г. старшыняваў Цэнтральнаму ўсебеларускаму народнаму выбарчаму камітэту. У 1946 годзе Гасан Канапацкі з сям'ёй пераехаў у Быдгашч. Памёр 11 мая 1953 г., пахаваны на могільніку па вуліцы Кцынскай у Быдгашчы.

Урачыстасць адкрыцця мемарыяльнай дошкі, арганізатарамі якой выступілі Таварыства прыхільнікаў Паморскага вайсковага музея і Згуртаванне мусульманскага адзінства, адбылася ў адпаведнасці з мусульманскай традыцыяй. У гэты ж дзень у Гарадской управе адбылася канферэнцыя пад лозунгам „Паміж Усходам і Захадам". З дакладамі пра палкоўніка Гасана Канапацкага выступілі Рафал Бергер, Мацей Канапацкі і Войцех Завадзкі, пра ўдзел мусульман у змаганні за незалежнасць Польшчы ў 1918-1920 гг. гаварыў Магмуд Тага Жук, а пра беларускае пытанне ў вайсковай дзейнасці генерала Станіслава Булак-Балаховіча расказаў Мацей Булак-Балаховіч.

З нагоды ўрачыстасцей, патранат над якімі ўзяў Гарадскі камітэт аховы памяці змаганняў і пакутніцтва ў Быдгашчы, выдадзена была адмысловая аднадзёнка „Паміж Усходам і Захадам".

(вл)

Асобу Гасана Канапацкага наблізіў імам Рафал Ахмед Бергер (у цэнтры)

Можна было б жыць, але няма здароўя



Фота АНДРЭЯ ЯЛОЗЫ

Сцяпан Пуц перад сваім домам

Расказвае СЦЯПАН ПУЦ, народжаны ў 1925 годзе ў Барысаўцы Гайнаўскай гміны.

Мае бацькі, Васіль і Параскева, мелі 12 гектараў зямлі. Праца на гаспадарцы была іх адзіным заняткам. Зямлю апрацоўвалі прымітыўнымі прыладамі. Усё рабілі ўручную. Вузкія палеткі былі раскінуты ў некалькіх месцах. Траву касілі косамі, збожжа жалі сярпамі, аралі конна. Палі часта залівала вада. Толькі пасля ліквідацыі цераспалосіцы ў жыцці сялян адбыліся станоўчыя змены.

У бацькоў было нас чацвёра: Надзея, Ян, Сцяпан і Васіль. Я правучыўся ў школе сем гадоў. У 1941 годзе прыйшлі немцы, а ў 1942 г. забралі мяне на прымусовыя работы ў Прусію. Трапіў я ў вёску Лаўт пад Кёнігсбергам. У мясцовым лагеры было 106 чалавек, якія працавалі пры высечцы лесу. Дрэва насілі мы на плячах. Усе мы жылі ў клуні. З усяго лагера засталося толькі 16 чалавек. Харчаванне было дрэннае. Буханку хлеба дзялілі на 12 лустаў. Атрымлівалі мы хлеб толькі раніцай і вечарам. Жылі мы пераважна за кавай.

Пасля паўгадовага прабывання ў лагеры ўцёк я ў родную Барысаўку. Але на радзіме давялося мне пабыць толькі месяц. 5 мая 1943 года мяне арыштавалі і вывезлі ў канцэнтрацыйны лагер Маўтхаўзен-Гузен у Аўстрыі. Там працаваў я на авіязаводзе, які выпускаў самалёты „Месершміт". Трымалі нас у бараках і блоках. Жыццё там таксама было цяжкое, кармілі нас пераважна кавай і хлебам. Буханку дзялілі на тры часткі, а раніцай была толькі кава. На абед кожны зняволены атрымоўваў адзін чарпак (750 грам) супу.

Калі асвабадзілі нас амерыканцы, уся наша група з васьмі чалавек пайшла пешшу ў аддалены на 25 км горад Лінц. Там мы ўзламаліся ў будынак, у якім знаходзіліся розныя дакументы. Паставілі мы сабе невялікі барак. У горадзе панавала беззаконне. Не было харчоў. Нехта прынёс труса, іншы прывёў каня. Тады аказалася, што ежы ў нас пад дастаткам і пачалі мы прадаваць конскае мяса. Улады абвінавацілі нас у нелегальным гандлі мясам і пастанавілі былых вязняў канцлагера сабраць на плошчы абведзенай калючым дротам. На машынах звезлі 7 тысяч чалавек. Гэта сустрэлася з вострай крытыкай, а ўлады абвінавачваліся ў заснаванні другога канцлагера. Пасля двух тыдняў на машынах перавезлі нас у Лінц, завялі на кухню, далі добрую ежу, другімі дзвярамі вывелі да вагонаў і вывезлі ў Польшчу.

Ужо ў Польшчы далі нам часовыя пасведчанні асобы (дакумент былых лагернікаў Маўтхаўзена меў нумар 75985) і па 100 злотых кожнаму. На падставе гэтага пасведчання можна было ездзіць па Польшчы два тыдні. Пасля гэтага часу далі нам пастаянныя пашпарты.

З таго часу пачалося маё асабістае жыццё ў вызваленай Польшчы. Паставіў я дом, у 1949 годзе ажаніўся з Надзеяй Сцепанюк з Навакорніна. Ад бацькі атрымаў я 2,5 гектара зямлі, рэшту дакупіў і ў выніку атрымалася 15-гектарная гаспадарка. Прыдбаў я таксама амаль усе сельскагаспадарчыя машыны. Жыццё склалася ўдала. У нас нарадзілася чацвёра дзяцей: Віця (1950), Мікалай (1956), Зінаіда (1958) і Міхал (1961). Разышліся яны ўсе па свеце. Віця ўжо 15 гадоў жыве ў Нью-Йорку, Коля працуе ў Мілейчычах лесніком, Зіна — у кааператыве ГС у Гайнаўцы, а Міхал заснаваў майстэрню па вырабе дзвярэй і акон. Зямлю і будынкі перадалі мы наймалодшаму Міхалу.

Цяпер мы з жонкай засталіся самі. Абое атрымоўваем пенсію, а мне плацяць яшчэ кампенсацыю за прымусовыя работы ў Нямеччыне. Грошай і харчоў у нас пад дастаткам. Можна было б жыць, але няма здароўя.

Запісаў Андрэй ЯЛОЗА

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2007 r. upływa 5 grudnia 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1683 egz.

Суседскія былі

БАБУЛІН ШАПТУН

— Схадзіў бы ты ўнучак да шаптухі, — папрасіла Петруся бабка Ганна такім жаласлівым голасам, нібыта пасылала па папа, каб апошні раз расказаць тое, што ўсё жыццё хавала ад бацькоў, мужа, дзяцей, і нават сабе самой трохі лгала. — Зусім мяне схапіла нейкая трасца, дыхнуць не магу. Хіба не дажыву да заўтра. Злётай, ты, унучак, да той, што карову летась на ногі падняла. Карове памагла, то можа і мне лягчэй зробіць. З Гарэцкаўшчыны, тая, хоць і бліжэй, але ж шмат бярэ, зараза. А толку з яе, як з казла малака. Вунь, Грышчыхіных цялят замаўляла пасля Пасхі, дык падохлі ўсе. А грошы ўсё адно ўзяла. Ты лепш да каменскай шаптухі на ровары з'ездзі, хай вады якой загаворыць. Тая, байкі, шмат не бярэ і лечыць добра. На, вазьмі рубель. Хопіць ёй і гэтага.

— Добра, з'езджу, — ляніва адказаў Пятрусь, хоць і не хацеў ехаць, але ж ведаў, што ўсё адно прымусяць. Узяў ён бабулін рубель, і праз сілу, як баран на бойню, закруціў педалямі ў бок Каменкі.

— Я хутка прыеду, — тлумачыў ён невялічкім групкам дзяцей, што ішлі хто на возера купацца, хто за вёску пагуляць, спадзеючыся, што нехта адгукнецца і паедзе разам з ім. Але дзеці не звярталі на яго ўвагі і займаліся кожны сваім. Толькі Толік, трошкі старэйшы суседскі хлопец, як убачыў у руках Петруся рубель, так і падскочыў, нібы яму крапівы ў трусы насунулі.

— Стой, Пецька, ты куды? — кінуўся ён наперарэз старэнькаму ровару.

— Ай, — уздыхнуў той. — Бабуля ў Каменку паслала, да шаптухі. Хоча, каб тая вады якой замовіла. Кажа, што памірае.

— Ну дык пара ўжо ёй, — заінтрыгаваўся сітуацыяй Толік. — Колькі ж можна жыць. Гэтыя старыя дурнеюць з гадамі. Ёй ужо ўсё адно нічога не дапаможа. Толькі грошы змарнуе. Што, цэлы рубель дала шаптусе аддаць?!

— Ага.

— Слухай мяне, — Толік стаў азірацца па баках, нібыта амерыканскі шпіён з савецкага фільма, які спрабуе завербаваць начальніка КДБ СССР.

— Чаго табе валачыся ў тую Каменку? Ты што, дурны? Лепш хадзем да аўталаўкі. Такія смачныя цукеркі прывезлі, каб ты ведаў! Купім на пяцьдзесят капеек. Хопіць шаптусе і паўрубля.

Пятрусь спачатку вагаўся, але вельмі хацелася цукерак. А яны такія смачныя былі, што праз паўгадзіны хлопцы купілі іх яшчэ раз, на тую палову рубля, што засталася ад першага разу. А як з'елі, бедны хлопчык пачаў плакаць:

— Што я бабцы скажу? Бацька мяне заб'е!

— Не заб'е, спакойна, — аблізваючы ад цукерак вусны, пачаў суцяшаць яго Толік. — Ты ж не кажы, што да шаптухі не трапіў. Зараз нальём якой вады ў бутэльку, завязеш яе бабцы. Скажаш, шаптуха сказала піць па тры глыткі перад узыходам і пасля захаду сонца, а таксама абмываць твар, рукі і тое месца, якое баліць. Шаптуны так заўсёды гавораць. Я сам чуў.

Так і зрабілі. Налілі ў бутэльку вады з крыніцы, кінулі туды некалькі вуглёў, насыпалі жменю вапны і кінулі нейкай травы.

— Каб табе, мой унучак, заўсёды сонейка свяціла, — пачуў Пятрусь назаўтра з ранку бабулін голас. — Каб ты здаровенькі быў! І шаптуха хай будзе здаровая. Як мне тая вада памагла, не расказаць.

І сапраўды, бабуся паднялася і лётала па хаце як маладая каза. Учарашнюю немач як рукой зняло. І калі праз некалькі дзён, як скончылася тая вада, яна Петруся зноў паслала ў Каменку, то ўнучак ізноў завітаў у аўталаўку. А ваду бабцы прыгатаваў па ўжо знаёмаму рэцэпту.

З тае пары прайшло каля паўгода. Надумалася бабка сама аддзячыць шаптусе. Акурат нехта на кані ў Каменку ехаў. Зайшла яна ў хату да шаптухі і давай так хваліць, што мала фотакарткі шаптушыных сваякоў, якія на сценах віселі, не паадварочваліся з сораму ад такой ліслівасці. А гаспадыня доўга старалася разабрацца, што да чаго, а пасля і кажа:

— Нічога я табе не замаўляла і грошай тваіх у вочы не бачыла. Надурыў цябе ўнук.

Што было пасля! Лупіў бацька любімага сыночка як сідараву казу. Усё хацеў дапытацца, у каго той ваду замаўляў. Пятрусь доўга не прызнаваўся, але ў канцы здаўся.

— Я сам замаўляў, — кажа. — Каб бабка не памерла, баяўся.

Пасля гэтых слоў бабка сапраўды ледзьве не астыла. А як выйшла са стану аслупянення пляснула далонямі ды як зараве:

— Гэта ж у цябе сіла ёсць каб лячыць, унучак. А твой бацька, злыдзень, ледзьве не забіў цябе. Ідзі да мяне, маё ты сонца.

Так Пятрусь стаў шаптуном. Як вырас, паўсюдна яго запрашалі. У акрузе другіх шаптуноў тады ўжо не было. Пазводзіліся недзе. Таму ўсе звярталіся да яго. Ён на людзях, праўда, эксперыменты не ставіў. Ведаў, адкуль той дар у яго ўзяўся. Ад бацькавай дзяжкі. Таму не рызыкаваў людзей лячыць. Ну а дзе ў каго жывёла зляжа, то прыходзіў. Людзі казалі, што памагае. Асабліва калі пасля шаптання калгасны фельчар укол той жывёле зробіць. Можа хто і сумняваўся ў здольнасцях цяпер ужо Пятра Іванавіча, але і той усё адно запрашаў яго. Якая розніца, аднаму фельчару прастаўляцца, ці яшчэ і шаптуну. На ўсялякі выпадак клікалі. А пасля перасталі. З'явілася ў акрузе нейкая новая шаптуха. Надта ж добрая, казалі. Кінуліся ўсе да яе. Людзі гаварылі, што Пётр Іванавіч добры шаптун, але тая лепшая. Ну а ў Пятра Іванавіча ад той лекарскай кар'еры толькі мянушка на ўсё жыццё засталася — бабулін шаптун.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

1. знахарка, якая замаўляе шэптам, 2. знешнасць, вонкавае аблічча, 3. высокая елка, 4. буйное млекакормячае трапічных краін з доўгім хобатам і двума біўнямі, 5. узвышэнне для прамоўцы, 6. спартсмен, які займаецца стральбой з лука.

(Ш)

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — метафара крывадушнасці.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 39 нумара

Карачы, сцяг, эстрада, хабар, парк, дыялект, дзёгаць, Тураў.



Рашэнне: **Час гэта бацька праўды.** Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

05.11 – 11.11

Баран (21.03. — 19.04.) Хуткія і адважныя ды трапныя рашэнні. Добры час на новыя інвестыцыі. Хутка забудзь аб таксічных сувязях, бо новы шанц праляціць табе каля носа!

Бык (20.04. — 20.05.) Некаторыя супрацоўнікі перастануць цябе цаніць. Затое страла Амура трапіць цябе як маланка. Атрымаеш ад лёсу падарунак: выйгрыш на латарэі ці спадчыну.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Фантастычная атмасфера на працы. Калі будзеш патрабаваць дапамогі, атрымаеш яе без цяжкасцей. Можа не хапіць часу на рэалізацыю ўсіх планаў. Працы аж зашмат, але варта. Роздумы аб тым, што ты атрымаў ад продкаў.

Рак (22.06. — 22.07.) Самотнаму Раку зоркі прынясуць каханне ад першага пагляду. Можаш рыхтавацца да замежнага падарожжа — там парвеш са старымі абмежаваннямі і пачнеш жыць поўняй жыцця. Крыху замяшання ў фінансах з-за твае легкадумнасці.

Леў (23.07. — 22.08.) Геніяльныя ідэі, каб памножыць маёмасць. Ды непаразуменні з партнёрам з-за таго, што можа ён выкарыстаць твой давер. Гайданка настрояў (увесь месяц!).

Дзева (23.08. — 22.09.) Вельмі ўдалыя экскурсіі; нават без карты трапіш куды трэба. Ды асцерагайся алкаголю. Не дайся ўцягнуцца ў інтрыгу на працы (ёсць асобы, якія на цябе звальваюць усю работу, а адна рассявае плёткі, ды строіць з сябе ахвяру)!

Шалі (23.09. — 22.10.) Нечаканыя шчаслівыя падзеі. Ды крыху расчараванняў і праваленых надзей; не плануй нерэальнага, бо можаш трапіць у кабалу. Агульна — у фінансах няблага (увесь месяц!).

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Агромная энергія, дзякуючы якой справішся з усімі супраціўнасцямі (увесь месяц!). Добрыя настрой, здароўе. 6-10.11. сямейныя і кватэрныя праблемы, спрэчкі, цяжкасці ў кантактах з бацькамі.

Стралец (22.11. — 21.12.) Ты проста дзіця шчасця! Поспехі ва ўсіх планах. Можа чакаць цябе добрая праца за мяжой. Не ідзі напрасткі і не камбінуй!

Казярог (22.12. — 19.01.) З 7.11. знойдзеш выхад з нават найбольш складанай сітуацыі, у фінансах не бойся рызыкі. Разлічвай на працы толькі на сябе. Замест чуллівых слоў можаш пачуць пару слоў праўды ад партнёра аб яго „спраўках".

Вадалей (20.01. — 18.02.) Шмат мілых сюрпрызаў, але незаладна са здароўем (павыкідвай нясвежае з халадзільніка! — пагражаюць табе цяжкія атручэнні!). Пастараешся — заробіш і падскочыш пару прыступак на лесвіцы кар'еры.

Рыбы (19.02. — 20.03.) 6-10.11. спрыяюць зоркі ў фінансавых, юрыдычных і банкавых справах; можаш старацца ўзяць крэдыт, дагаворвайся на бізнесовыя сустрэчы. Ды не збірайся хадзіць на рандэву; можаш закахацца без узаемнасці ці агульна расчаравацца. Уважліва чытай аб'явы — можаш трапіць на даўно чаканую прапанову.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960


Сакрат Яновіч

Ніва
ПРА МІНУЛАЕ

Георгій Валкавыцкі

Гісторыя пісаная з „Нівай”

13 і 14 кастрычніка г.г. у Беластоку ў рамках Беларускіх дзён „Нівы” адбылася навукова-папулярная канферэнцыя. У канферэнцыі прынялі ўдзел відныя прадстаўнікі беларускага культурнага і грамадскага жыцця з Беласточчыны, Беларусі, дыяспары і блізкага замежжа.

Даклад „Беларускія газетныя выданні на Беласточчыне да ўзнікнення „Нівы” ў 1956 годзе” зачытаў **Алег Латышонак** з Беластока. Ужо ў 1861-1862 гг. праўдападобна ў Беластоку выйшлі чатыры нумары „Гутаркі двух суседзяў”. „Мужыцкую праўду” выдавалі людзі звязаныя з Беласточчынай і трэба меркаваць, што і яна магла выдавацца на Беласточчыне — у Саколцы. Віленская „Наша ніва” мела сваіх карэспандэнтаў з тагачасных Беластоцкага, Бельскага і Сакольскага паветаў.

Пасля першай сусветнай вайны са жніўня 1922 года выйшла пяць нумароў „Беларускага партызана”, якога рэдакцыя мела быць у партызанскім штабе ў Белавежскай пушчы. Мяркуецца, аднак, што рэдакцыя часопіса была ў Агароднічках каля Супраслі, а душой рэдакцыі была Вера Маслоўская, якая была з Агароднічак родам, а працавала ў Грабаўцы каля Дубіч-Царкоўных. Газета, апрача навін і агітматэрыялаў, змяшчала таксама літаратурныя матэрыялы. Адным з аўтараў мог быць сам камандзір партызанскага атрада Герман Шыманюк, які пісаў на сваёй гаворцы, а Вера Маслоўская правіла іх на літаратурную беларускую мову.

Алег Латышонак

З прыходам саветаў узнаўляецца беларускі друк. Спярша саветы выдавалі „Освобождённый Белосток”, які пад канец 1939 года прыняў беларускую назву „Вольная праца”. Газета выходзіла пяць разоў у тыдзень тыражом 10 тысяч асобнікаў; падпісалася на яе каля трох з паловай тысяч чытачоў. Друкаваліся таксама раёнкі, напрыклад, з кастрычніка таго ж года ў Граеве выходзіла „Wolne Życie”, у якім былі і беларускамоўныя матэрыялы. У Саколцы ў той час выходзіла „Победа” на рускай і беларускай мовах.

Пад нямецкай акупацыяй з 29 красавіка 1942 года стала ў Беластоку выходзіць „Новая дарога” — тыднёвік для Беластоцкай акругі. Да 1944 года выйшла звыш ста нумароў газеты. Пісалі ў ёй маладыя літаратары. Газета адыграла важную ролю ў станаўленні беларускай нацыянальнай свядомасці, у стварэнні патрэбнасці ў беларускім слове, у пракладванні дарогі „Ніве”...

Сяргей Чыгрын

Чарговым дакладчыкам быў **Сакрат Яновіч**, які расказаў пра свае пачаткі ў „Ніве” і дадаў некалькі афарыстычных заўваг пра асяроддзе, у якое кіраваўся наш тыднёвік. У палове пяцідзесятых гадоў XX стагоддзя, калі нараджалася „Ніва”, не было ў нас адукаваных па-беларуску людзей, бо пра гэта задбалі два імперыялізмы: савецкі і польскі. Тыя, што былі пры немцах, або ўцяклі за Захад, або выехалі ў СССР. Найбольшым тут знаўцам беларускай мовы быў украінец Ілья Бернат.

Сам Яновіч да гэтага працаваў электрыкам у „Фастах” і з дому вынес больш рускай чым беларускай адукацыі. Калі атрымаў запрашэнне на працу ў рэдакцыю, маці расплакалася, а бацька, які быў шаўцом, збіў новыя чаравікі. І толькі ў рэдакцыі даведаўся ён пра Купалу і Коласа. З рэдакцыйнага калектыву толькі Вера Леўчук і сам Яновіч валодалі беларускай мовай, прытым у параўнанні з ім спадарыня Леўчук была, можна сказаць, інтэлектуалкай. Апошнія працаўнікі рэдакцыі вучыліся мове і найперш авалодаў ёю сам Георгій Валкавыцкі.

Цяпер „Ніва” ў параўнанні з яе пачатковым перыядам вельмі змянілася. Цяпер у рэдакцыі працуюць толькі адукаваныя людзі, а калісь там не ведалі, хто такі магістр; адукаванасць была тады сенсацыяй. І калісь „Ніва” была народнай газетай, яе чыталі па вёсках. Але яна не стварае нацыі, нацыю стварае горад. А цяпер „Ніва” гарадская, бо няма вёскі; у 1960-я гады ў Крыноцкай гміне было дваццаць чатыры школы, а цяпер асталася толькі адна.

„Ніву” стварылі ўлады, бо ж не было для яе ні паўстання, ні забастовак, ні дэманстрацый. І калі ўлада што захоча, тое і зробіць; абы ўлада давала грошы, то і ахвотныя людзі знойдуцца. І гэтыя пяцьдзесят гадоў „Ніва” праіснавала дзякуючы ўладзе. Калі б уявіць, што хацеў бы хто газету зліквідаваць, тое і зрабіў бы. І не было б ніякага бунту, а нават сораму не было б: абсмяялі б, затапталі б, зганьбавалі б. Бо мы, як нацыя, вельмі слабыя, вельмі вясковыя, а такім лёсам нечага ганарыцца. Бо няма шчаслівейшага чалавека як мужык, які стаў жыць у горадзе.

Сяргей Чыгрын са Слоніма гаварыў пра культурна-літаратурную Гродзеншчыну на старонках „Нівы”. Сам дакладчык пазнаёміўся з нашым тыднёвікам у пачатку 1980-х гадоў; пазнаёміў яго слонімскі паэт Анатоль Іверс. Іверс параіў Чыгрыну паслаць у „Ніву” свае вершы. І на здзіў хутка вершы з'явіліся на старонках тыднёвіка; а ў Беларусі была вялікая літаратурная чарга ў друк.

У 1980-х гадах у Слоніме было васьмярых падпісчыкаў „Нівы”. І калі пастаўка газеты зацягвалася, Іверс хадзіў на пошту сварыцца за „Ніву”; пасля гэтага тыднёвік з Польшчы пісьманосцы прыносілі адразу пасля паступлення на пошту.

„Ніва” пісала шмат пра людзей Гродзеншчыны і, у прыватнасці, Слонімшчыны, у тым ліку пра Ларысу Геніюш, Аляксея Карпюка, Гальяша Леўчыка і Лукаша Дзекуць-Малея, шмат слонімскіх аўтараў друкавалася ў ёй. Дарэчы, „Ніва” друкавала творы не толькі сваіх польскіх беларускіх літаратараў, але і амаль усіх аўтараў з Гродзеншчыны. І сёння „Ніва” з'яўляецца не толькі беластоцкім, але і гродзенскім незалежным выданнем, бо на гэты момант на Гродзеншчыне ўцалелі толькі дзве незалежныя газеты — у Лідзе і Слоніме. А ў самым Гродне беларускасць спыняецца...

Намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі **Барыс Сачанка** з беластоцкім друкам пазнаёміўся ў канцы 1970-х гадоў, з „Беларускім календаром”. Было гэта вельмі цікавае выданне, былі ў ім такія вершы, якія ў БССР не пісаліся: свабодныя, разняволеныя — мова была пра жыццё, а не пра ідэалогію. Беластоцкая літаратура паказалася еўрапейскай, без вялікіх жанраў, без вытворчай тэматыкі, трымалася сваёй зямлі. Гэты працэс адбываўся дзякуючы Георгію Валкавыцкаму і ягоным супрацоўнікам, а выпрацаваныя імі традыцыі ў 1980-х гадах падхапіла новае пакаленне. Не кожная беларуская вобласць можа пахваліцца такім укладам у беларускую літаратуру як невялікая Беласточчына. І гэта ў абставінах, калі тут усё робіцца без беларускай дзяржавы, якая адвярнулася ад сваіх людзей. Гэтая дзяржава скінула ў падполле Саюз пісьменнікаў Беларусі, у якім сёння каля паўтысячы літаратараў, якія не прызнаюць умяшальніцтва дзяржавы ў свабоду літаратурнай творчасці.

Вячка Станкевіч са Злучаных Штатаў Амерыкі расказаў пра ўзаемадзеянні амерыканскай беларускай дыяспары з Беласточчынай. Тамашняя дыяспара пачала гуртавацца ў канцы 1940-х гадоў. Асабістыя кантакты з Беласточчынай былі, але яны асабліва ўзмоцніліся пасля з'яўлення „Нівы”. Першыя нумары тыднёвіка выклікалі вялікі энтузіязм у амерыканскіх беларусаў, яны стварылі парасткі надзеі на беларускае адраджэнне і ў саветызаванай Беларусі. Эміграцыя ўключаецца тады ў жыццё беларусаў Беласточчыны; пачынаецца ліставанне з пісьменнікамі, аказваецца дапамога ў пабудове храмаў. У 1960-х гадах амерыканскія беларусы паспяхова разглядаюцца па Беласточчыне за жонкамі; Беласточчына ўражвае іх, наступае збіранне грошай на Музей, на шпіталь у Гайнаўцы.

Вячка Станкевіч

Візіт Аляксандра Баршчэўскага ў ЗША дае чарговы штуршок кантактам з Беласточчынай. Вялікай цікавасцю дыяспары карыстаюцца „Беларускія календары”, узнікае ін-

[працяг ☞ II]

9 770546 196000

[I ☞ працяг]

цыятыва пасылак з Амерыкі ўжыванай вопраткі — так як пасля вайны амерыканцы пасылалі яе беларускім уцекачам у Еўропе. Беласточчыну наведвае Данчык, а Амерыку Лявон Тарасэвіч, Сакрат Яновіч, калектыў „Дубіны", студэнты, старэйшыя... Ала Орса-Рамана была захоплена маладым пакаленнем Беласточчыны, надзеяй на захаванне беларушчыны. Кантакт з беларусамі Беласточчыны ладзіцца лёгка, бо тут людзі не былі саветызаваны, у іх асталася асабістая адказнасць, прыватная ўласнасць; гэты кантакт важны для падтрымкі дыяспары перад асіміляцыяй. Прыходзіць пакаленне басаўцаў, якія працягваюць працу сваіх папярэднікаў, бяруць адказнасць за беларускасць.

З абвяшчэннем суверэнітэту інтарэс дыяспары перамяшчаецца ў Беларусь. Аднак з цягам часу, з адыходам Мінска ад надзей дыяспары, гэты інтарэс згортваецца, зноў надзея кіруецца на Беласточчыну, што яна стане беларускім П'емонтам...

Вядучы ў той час канферэнцыю Ян Чыквін заўважыў, што мы тут бачым сябе і як П'емонт, і як Тэрмапілы.

Алесь Бяляцкі расказаў пра сітуацыю беларускасці ў Беларусі, дзе прынцыповай мэтай каланізатараў было знішчэнне беларускай мовы. Цяпер Беларусь нагадвае кавалак пластыліну, які Лукашэнка фармуе як хоча. І ён не бачыць тут месца для беларускай мовы, так як у калгасе ў 1970-80-х гадах. Беларуская мова ў пагардзе — міністры культуры ці адукацыі, рэктары пазбягаюць яе ўжывання. І гэта, здаецца, вызначае таксама пра іх стаўленне да незалежнасці краіны.

У народзе, постсавецкім грамадстве, працэс адыходу ад мовы адбываецца паралельна з перасяленнем у горад; там месяц-два і чалавек адыходзіў ад мовы „адсталай,

Ян Чыквін

нацыяналістычнай". Сёння горад рускамоўны, вёска гаворыць на трасянцы, але і тут дзеці ўжо гавораць па-руску.

У рэферэндуме з 1990 года 12% насельніцтва Беларусі было за незалежнасцю краіны а 25% — за дзяржаўнасцю беларускай мовы. Сёння сітуацыя складаная, бо няма сацыялагічных даследаванняў на гэту тэму і невядома якія тут меркаванні нашых моцна абруселых людзей. Да беларускай мовы людзі ставяцца прыязна і гэта абнадзейвае. Аднак нацыянальна свядомыя людзі пасіўныя: ведаюць мову, але яе не ўжываюць, могуць вучыць дзяцей, але не вучаць. Які народ, такая інтэлігенцыя...

Аптымізм нейкі, аднак, ёсць. Няма краіны ад Брэста да Уладзівастока, ёсць свая дзяржава, яна ўздымае свядомасць. Расце колькасць людзей што лічаць сябе беларусамі. І тут непрапарцыянальна малая Беласточчына можа сыграць непрапарцыянальна вялікую ролю.

Ніна Баршчэўская свой даклад прысвяціла беларускаму школьніцтву ў Польшчы. Да паловы 1970-х гадоў статыстычныя лікі добра характарызавалі тое школьніцтва. Аднак эканоміка і дэмаграфія не далі падтрымкі беларускаму адраджэнню з паловы 1950-х гадоў.

Ніна Баршчэўская

У палове 1970-х гадоў лік вучняў і школ з беларускай мовай рэзка падае і ўжо не вяртаецца да ранейшага ўзроўню.

У вышэйшых навучальных установах беларуская мова прысутнічае ў Варшаве, Беластоку і Любліне. Лік студэнтаў беларусістыкі вырас з абвяшчэннем суверэнітэту Беларусі, але з паловы 1990-х гадоў — паралельна заняпаду значэння беларускай мовы ў яе тытульнай дзяржаве — той лік пайшоў на спад. Сёння беларуская мова пераўтвараецца ў нас з вясковай у мову інтэлігенцыі.

Пра беларускую літаратуру Беласточчыны расказаў старшыня Літаб'яднання „Белавежа" **Ян Чыквін**. Астаецца здзіўляцца, — пачаў ён, — жывучай сіле, закладзенай у гены беларусаў. У час вайны быў тут, як заўважыў Масей Сяднёў, маленькі кароткі рэнесансік. Пазнейшае паўстанне літаб'яднання было фактам натуральным і своечасовым. Георгій Валкавыцкі стаў тым магнітам, які сабраў у творчы калектыў вельмі розныя індывідуальнасці. Прыярытэт аддаваўся не ідэалогіі, але асабістым пошукам аўтараў. „Ніва" кансалідавала творчых асоб, засцерагаючы іх ад нацыянальнай творчай здрады.

Славамір Іванюк

У саракагадовым суіснаванні Літаб'яднання „Белавежа" з „Нівай" неаспрэчная заслуга Георгія Валкавыцкага, які не зачыніўся ў правінцыйных рамах, але адкрыўся і паціху ішоў насупраць асноўнага цячэння свайго часу — каб выявілася душэўная субстанцыя творчага патэнцыялу беларусаў Беласточчыны. У „Ніве" хутка друкавалі творы аўтараў цалкам розных пакаленняў.

„Ніва" бадай першай стала збіраць рассыпаныя камяні ў новы падмурак айчыны. Літстаронка адлюстроўвала плюралізм пісьменнікаў, розныя тэмы і творчыя схільнасці аўтараў. Тут дэбютавала звыш пяцідзесяці аўтараў, тут было надрукавана звыш трох тысяч літаратурных твораў — некалькі ладных тамоў, уражальная колькасць!

Ніўскія літаратары паказалі сябе людзьмі з выразным нацыянальным вектарам, паказалі розныя стылі і творчыя дамінанты; гэтая багатая палітра дае адлюстраванне нашага

Ганна Кандрацюк

часу. „Ніва" была калыскай нашых літаратараў, цэнтрам і родным домам. А яны выйшлі з гэтага дому ў свет, астаючыся ўдзячнымі роднаму парогу.

Пра «Сустрэчы „Зоркі"» ў 1995-2002 гг. расказала іх ініцыятарка — рэдактар **Ганна Кандрацюк**. Ідэя Сустрэч нарадзілася з патрэбы: у школах не наглядалася дзяцей, што размаўлялі па-беларуску. На першыя Сустрэчы, што адбыліся ў Меляшках, запрасілі дзяцей са школы ў Гарадку, якія найлепш чулі беларускую мову. У меляшкоўскія сустрэчы заангажаваліся многія людзі, у тым ліку асабліва жыхары вёскі. На чарговыя Сустрэчы запрашалі гарадскіх дзяцей, асабліва з бельскай „тройкі", тых, што праяўлялі вялікую цікавасць да беларускай мовы — яны бачыліся стрыжнем, які меў паўплываць на іншых. На Сустрэчы запрашалі выдатных цікавых і таленавітых людзей. Праводзіліся на іх журналісцкія, мастацкія і літаратурныя заняткі. І шмат былых „сустрэчнікаў" піша, стала журналістамі, некаторыя прадстаўляюць нашу краіну ў замежжы.

Славамір Іванюк гаварыў пра архіўныя знаходкі ў партыйных дакументах наконт „Нівы". У Беластоку няма доказаў, што быў намёк з Варшавы наконт стварэння ў „адлігу" сярэдзіны 1950-х гадоў беларускіх установаў, у тым ліку і „Нівы". У палове 1955 года наступіла змена стаўлення беластоцкіх ваяводскіх улад у напрамку вызвалення беларускай актыўнасці. Быў пастулат з Бельска, каб выдаваць беларускую газету.

У жніўні 1955 года Мар'ян Ксёнжэ, сакратар прапаганды Ваяводскага камітэта Польскай аб'яднанай рабочай партыі ў Беластоку паслаў у ЦК ПАРП хадайніцтва за згодай на беларускую газету. Аргументаваў свае захады большай у беларускіх вёсках наяўнасцю калгасаў, грамадскімі пачынамі беларускага насельніцтва і рэвалюцыйным мінулым, што трэба яшчэ больш, па-беларуску, мабілізаваць людзей да стаўленых партыяй задач. І што газета патрэбная школам, мастацкім ансамблям. І агульна: для развіцця беларускай культуры...

У рэдакцыі новай газеты прадбачвалася 14 штатаў, у тым ліку траіх перакладчыкаў; тыраж планаваўся на ўзроўні сямі тысяч асобнікаў.

У чэрвені 1957 года была дадзена першая ацэнка працы рэдакцыі, была яна крытычная. Партыйныя ўлады патрабавалі прысвячэння большай увагі сялянскім масам, моладзі, жанчынам. Згадвалася пра патрэбу літаратурнага дадатка.

4 мая 1959 года адбылася першая спроба адхілення Георгія Валкавыцкага ад пасады галоўнага рэдактара „Нівы", аднак на яго месца пакуль не ўдалося нікога знайсці. Гэты крок супадаў з адыходам ад адлігі, з'явіліся ўжо спробы дашукоўвацца ў рэдакцыі „błędów i wypaczeń".

У 1961 годзе з атакай на „Ніву" выступіў у партыйных кругах тадышні першы сакратар Павятовага камітэта ПАРП у Сейнах Аляксандр Лебядзінскі. Вядучы закід быў пастаўлены рэдакцыі за публікацыю інтэрв'ю са святаром. Віной рэдакцыі было і тое, што нумар са згаданым інтэрв'ю людзі адразу раскупілі. І што людзі святкуюць Новы год 14 студзеня...

У палове 1970-х гадоў наглядаецца фінансавы ціск на „Ніву": журналісцкія аклады ў беларускім тыднёвіку сталі ўдвая меншымі чым у прэсавым ваяводскім органе партыі...

Юры Туронак расказаў пра беларускае школьніцтва на Беласточчыне.

Юры Туронак

Гэтая праблема ўзнікла ў 1916 годзе, калі фельдмаршал Гіндэнбург, які камандаваў прысутнымі ў нас нямецкімі вайскамі, загадаў адкрываць школы, але толькі на роднай мове насельніцтва. Гэта выключала так рускую, як і польскую мовы са школ для беларусаў. Але не было ні беларускіх настаўнікаў, ні кніг, ні традыцыі. Лічаныя беларускія школы былі ліквідаваны да 1919 года. Беластоцкі, Бельскі і Сакольскі паветы ў санацыйны перыяд не ўлічваліся да Крэсаў і тут навучання беларускай мове не было да прыходу саветаў у 1939 годзе.

Асветнае аддзяленне люблінскага ўрада Польшчы ўжо ў 1944 годзе

[працяг ☞ III]

[II ☞ працяг]

ставіла на парадак дня навучанне беларускай мовы. Быў і праект беларускага часопіса для школ, але нічога з гэтага не атрымалася, бо на Беласточчыне не было адукаваных па-беларуску кандыдатаў. Людзі, што былі ў ваенны час звязаны з „Новай дарогай", або выехалі ў эміграцыю, а калі асталіся на месцы, то сядзелі ціха.

У 1944 годзе на Беласточчыне працягвала існаваць беларускае школьніцтва, што асталося ад саветаў і немцаў. У 1947 годзе тыя школы былі скасаваны, а ў 1949-м — аднаўлены. Такім чынам да выхаду „Нівы" праз 8 гадоў на Беласточчыне працавала каля двухсот пачатковых школ і пяць сярэдніх, у якіх вучылася звыш дзесяці тысяч навучэнцаў.

Пасля кастрычніка 1956 года па-

Вінцук Вячорка

веяла ў Польшчы новай палітыкай, быў уведзены прынцып дабравольнасці. У школах стала падаць зацікаўленне роднай мовай, з аглядкай, вядома, на Беларусь — бо калі ім непатрэбная, то навошта яна нам...

У 1975 годзе ў „Ніве" праходзіла дыскусія на тэму „Чаму дзіця не вучыцца роднай мове". Але ў той час ліквідаваліся ўжо Беларускі музей у Белавежы, эстрадная група „Лявоніха", закрываліся малыя школы. Такім чынам былі ліквідаваны дзесяткі беларускіх школ; ішоў працэс ліквідацыі беларускага школьніцтва. А ўлады ставіліся да гэтага цынічна: „Такая воля бацькоў"...

Вінцук Вячорка гаварыў пра пагрозы і шанцы беларускай дзяржаўнасці. У апошнім часе перад беларускай апазіцыяй узнікла дылема: ці трымацца дэмакратычнага выбару, ці падтрымаць незалежніцкія памкненні актуальнай улады. Яшчэ пяць гадоў таму нельга было гаварыць пра краіну і незалежнасць, а цяпер змяніліся абставіны, змяніўся канцэпт беларускай дзяржаўнасці.

Аднак, здаецца, астаецца ўсё яшчэ ў сіле трактоўка Беларусі як трампліна Аляксандра Лукашэнкі для атакі на расійскае палітычнае поле. Сёння ў Расіі Лукашэнка мае палітычны рэйтынг н-р 2, пасля Пуціна, а ў некаторых губернях ён нават наперадзе. І калі Пуцін адмовіцца ад трэцяга тэрміну прэзідэнцтва, то... Лукашэнка запрашае да сябе расійскіх журналістаў, добра іх прымае, а яны ў сябе павышаюць ягоны рэйтынг...

Эканамічная мадэль беларускай гаспадаркі савецкая, з прымессю капіталізму. Адной з часовых крыніц эканамічнай стабільнасці ў Беларусі з'яўляецца паліўная датацыя Расіі. І Лукашэнка супрацоўляецца росту цэн расійскай нафты для Беларусі. Бо калі б тыя цэны павысіць да такога роўню, як у гандлі з іншымі краінамі, то ў Беларусі наступіў бы спад заробкаў на прыблізна 12%, інфляцыя вырасла бу 3-4 разы, спыніліся б сацыяльныя датацыі, спынілі б вытворчасць бюджэтаўтваральныя прадпрыемствы, а гэта быў бы сур'ёзны падрыў эканамічных фундаментаў улады.

Цяпер мадэль беларускай улады ў шмат чым нагадвае Прыднестроўе, асабліва ў савецкай сімволіцы. Аднак магчымая змена палітыкі і рыторыкі цяперашняй мінскай улады, калі б змяніліся абставіны ў Расіі. Відаць гэта хаця б па некаторых жэстах улад, напрыклад, па нядаўнім візіце мінскай дэлегацыі ў Кіеў наконт уніфікацыі нафтавых тарыфаў; ёсць і паказушныя жэсты ў адносінах да НАТО. Бо калі ад аднаго подпісу ў Газпраме сыпнецца беларуская эканамічная стабільнасць, то нават дасюль індыферэнтныя да палітыкі жыхары Беларусі могуць выйсці на вуліцы...

Яўген Мірановіч

Яўген Мірановіч расказаў пра адлюстраванне „Нівай" грамадска-палітычнай думкі беларусаў Беласточчыны. Тыднёвік адлюстроўваў яе ў першыя гады свайго існавання. Тады ў „Ніве" царыў энтузіязм для ўсяго, што ўсё тут добра і рухаецца ў добрым напрамку. Быў аптымізм, што будзе яшчэ лепш.

У палове 1960-х гадоў аптымізм гасне, і гэта ў тых саміх людзей! Наступае зварот у бок мінуўшчыны коштам актуальных спраў — яны настолькі адсутныя, што ствараецца ўражанне быццам з цягам часу ўсё чытаўся той самы нумар газеты.

У канцы 1970-х гадоў заміж слова „беларус" з'яўляецца „жыхар Беласточчыны"... Станоўчае стаўленне да будовы Семяноўскага вадасховішча, да перасялення людзей у блёкі.

У канцы 1990-х гадоў з'яўляюцца новыя плыні, шмат тут захаплення дэмакратыяй — так як калісь сацыялізмам. У 1950-х гадах ніўскія журналісты адлюстроўвалі пункт гледжання большасці беларускага грамадства Беласточчыны, а ўжо ў 1990-х — меншасці; наша грамадства аставалася верным прынцыпам, замацаваным у ранейшыя дзесяцігоддзі.

Найбольш шчырае выяўленне грамадскай думкі было ў допісах карэспандэнтаў. Гэтыя допісы былі настолькі прывязаны да ўвабранага раней бачання свету, што выказванняў некаторых карэспандэнтаў нельга было выносіць на старонкі, бо такія меркаванні шмат-дзе на Захадзе забаронены папросту законам.

Марцін Рэмбач расказаў пра кулісы журналісцкага асвятлення нядаўняй г.зв. справы „Нівы".

Паліна Сцепаненка, так як і ейныя прадмоўцы з Беларусі, расказала пра тое новае, несавецкае, бачанне свету, якое прыносіла „Ніва". Пазнейшыя паездкі на Беласточчыну дазволілі савецкім беларусам пабачыць у нас больш вольных і больш адкрытых людзей.

Алена Макоўская заўважыла, што беларускі друк пачынаўся ў замежжы. Францішак Скарына стаў у 1517 годзе выдаваць сваю Біблію ў Празе, Аляксандр Рыпінскі свой этнаграфічны беларускі зборнік выдаў у 1840 годзе ў Парыжы, а верш Паўлюка Багрыма „Зайграй, зайграй, хлопча малы" пабачыў свет у 1864 годзе ў Лондане.

У мінулым стагоддзі шмат беларускага друку паказвалася ў замежжы. У 1926-1932 гг. выходзіла ў Чыкага „Беларуская трыбуна", у Мюнхене ў 1947-1966 гг. — штотыднёвік „Бацькаўшчына", з 1950 года ў Нью-Йорку — газета „Беларус". Як падлічылі Вітаўт і Зора Кіпелі, аўтары бібліяграфіі беларуска-

Алена Макоўская

га друку, за межамі Беларусі было зарэгістравана 414 перыядычных беларускіх друкаў...

Беластоцкая „Ніва" з'яўляецца не толькі газетай, але і асяродкам беларускай культуры. Яе значэнне сёння ўзрастае з-за абмежавання беларускага друку ў самой Беларусі.

Навукова-папулярная канферэнцыя падвяла сінтэз не толькі паўвекавой гісторыі „Нівы", але таксама і беларусаў у Польшчы, да якіх яна была скіравана. Тут, на гэтых старонках, немагчыма мне было стэнаграфічна прадставіць усіх выказванняў, бо стараўся я запісаць толькі найцікавейшыя. Усё ж такі думаю, што і гэта цікава.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ
Фота Тацяны КАЗАК

З надзеяй на чарговую сустрэчу

Ехаў я ў Беласток на юбілей „Нівы" з надзеяй сустрэцца з даўнейшымі калегамі па пяру, як калісьці гэта бывала на з'ездах карэспандэнтаў. Разумеў я, што многія адышлі з таго свету (няхай зямля ім пухам будзе). Разлічваў я на спатканне з Мікалаем Лук'янюком, Васілём Петручуком, Мікалаем Панфілюком, Грышам Марозам, Пятром Байко, Міхасём Куптэлем ды са шмат іншымі. Не ўспамінаю журналістаў, якія зараз знаходзяцца на заслужаным адпачынку. На жаль, згаданыя мною карэспандэнты (акрамя Грышы Мароза) адсутнічалі ў юбілейных святкаваннях. Шкада, бо другой такой імпрэзы не будзе, а наступнага круглага юбілею не дачакаем.

Першым мілым для мяне сюрпрызам было, зразумела, уручэнне юбілейнага альбома. Калі знаёміўся я з яго зместам, падышла да мяне жанчына, прозвішча якой я не змог прыгадаць. „Адкуль сама будзеш?" — пытаю сяброўку. А гэтая з хітрынкай усміхаецца і кажа: „Не прыпамінаеце, пан Валодзя? Калісьці мяне з хлопцам памылялі... Жэня Мартынюк... З Зубава выходжу. У Бельску зараз жыву". Неўзабаве да нашай кампаніі далучыўся Марк Цыбарт з-пад Сямятыч, затым Міхась Хмялеўскі, Марыся Федарук і Вера Леўчук. Паколькі з Міхасём і Марысяй мы яшчэ нядаўна сустракаліся ў рэдакцыі, дык з Верай Леўчук не бачыліся мы больш дваццаці гадоў. Прыемна было ўспомніць мінулыя будні...

У залу што і раз заходзілі новыя госці, сярод якіх прыкмеціў я Грышу Мароза са Старога Беразова. Афіцыйную частку мерапрыемства, як сапраўдны прафесіянал, вёў Юрка Ляшчынскі. З кароткай прамовай выступіў Яўген Вапа. Затым былі святочныя віншаванні і ўручэнне сувеніраў. Ад імя ўзнагароджаных выступіў Сакрат Яновіч, які сказаў: „Пэўна не пакрыўдзіцеся за гэта, што ад усіх вас падзякую за ўзнагароды, бо, калі б кожны хацеў выступіць, дык прыйшлося б каля трох гадзін яшчэ чакаць".

З гатэля „Галэмбеўскі" прысутныя перайшлі ў рэстаран „Гродна" на супольную вячэру. Народнай музыкай і песняй весяліў прысутных гурт Генадзя Шэмета. Цудоўна іграли музыканты. Хвала ім за гэта! Вечар правёў я ў кампаніі Марка Цыбарта, Жэні Мартынюк, Грышы Мароза і Пятра Крука, з якім я меў нагоду ўпершыню пазнаёміцца. Харошы ён кампаньён, безупынна сыпаў анекдотамі. Паколькі Пятро родам з Навасадаў, дык знайшлася нагода для таго, каб успомніць дзяўчат з мастацкага калектыву, які актыўна дзейнічаў на Гайнаўшчыне на зломе пяцідзесятых і шасцідзесятых гадоў. Марыся Баўтрамюк, Вера Крук, Оля Трашчотка, Марыся Салавянюк ды іншыя, якія захаплялі публіку на канцэртах цудоўнымі галасамі і сваёй чароўнасцю. Гэта былі сапраўдныя сейбіты беларускай песні і культуры. На гэтай вечарыне мяне спаткаў яшчэ адзін прыемны сюрпрыз. Сустрэча з Галенай Тапалянскай, у якой я калісьці гасцяваў у Трасцянцы, калі яна працавала настаўніцай. Шмат гадоў з таго часу прайшло. Прызнаюся шчыра, што я не пазнаў яе. Час хутка ўцякае, даражэнькія, і яго немагчыма вярнуць, як і маладосці. Прыгадвае нам аб гэтым альбом, які мы атрымалі ў падарунку. Цудоўная рэч. Унікум для пакаленняў, як і для гісторыі нашай Малой Айчыны — Беласточчыны. Шкада было пакідаць застолле ў поўным разгары. Каму ў дарогу, таму час. Так са мною было. Развітаўшыся са сваёй кампаніяй, з надзеяй у сэрцы на чарговую сустрэчу ў ніўскай сям'і, поўны ўражанняў вяртаўся я апоўначы ў Чаромху.

Уладзімір СІДАРУК

Беларусы сто гадоў назад (2)

(працяг; I частка ў 42 н-ры)

Па 1905 годзе дваранская сутнасць, „сярэднявечча" Расійскай імперыі засталася тая самая — бо для чаго і як магла памяняцца?! Але навонак быў другі. Газеты, выбары, палітычныя партыі, Дума ў сталіцы і мясцовыя „земствы", нацыянальныя рухі малых і вялікіх народаў... Аляксандр Азнобішын па-ранейшаму гаспадарыў у Мастах-над-Нёманам і Сельскагаспадарчым таварыстве, ездзіў на інспекцыі як „начальник 3-го Гродненского Участка" і пісаў рапарты губернатару, але цяпер тыя рапарты больш нагадвалі... глыбокія псіхалагічныя аналізы і літаратурна-філасофскія эсэ — „действительный статский советник" не так апісваў жыццё, як асэнсоўваў.

— Той сялянскі рух, якога няма і які так усіх непакоіць, — ва ўмовах жыцця і звычак беларускага сялянства гэта хаос і стыхія, тут дарэмна шукаць нейкіх галавароў, кожны толькі крычыць пра сваю бяду, для таго нават ад адной вёскі цяжка дабіцца нейкіх агульных патрабаванняў, хочуць усе ўсяго адразу і кожны сам для сябе...

Праваслаўнае святарства, як рускае, так мясцовае, не мае ніякага ўплыву на беларускую вёску, святары ад сялянаў часта яшчэ далей, чым памешчыкі, паводзіны святароў пыхлівыя да яснавяльможнасці, гавораць па-хамску, глядзяць на сялянаў, як на дойную карову... Бяруць за ўсё і бяруць больш і больш. За споведзь, пахаванне, наведанне паміраючых, за абход палёў і малебен пра дождж і ўраджай... У ксяндза вісіць у плябаніі барометр, і ксёндз з амбона лішні раз пра дождж не гаворыць, а толькі напэўна, як метэаролаг, а наш бацюшка вучыць, што без малебна не будзе ў сушу дажджу, а без грошай будзе „сухі малебен", гэта значыць, ніякага... Такія бацюшкавыя прымаўкі свае ў кожнай царкве і вядомыя па ўсіх вёсках прыхода. Сяляне ўспрымаюць праваслаўнае святарства як непазбежнае зло, рэлігійнасць катастрафічна малее, і вера ў Бога засталася толькі ў вясковых жанчынах. Мужчыны ж у адзін голас адкрыта гавораць, што Святое Пісанне і жыццё цяперашніх святароў гэта неба і зямля, і што бацюшкі самі не вераць у Бога, калі не маюць ні страху, ні сораму...

Да ведама нас усіх, праваслаўных і рускіх, польскія каталіцкія ксяндзы маюць поўны давер і непадважальны аўтарытэт у сваіх парафіях. Што сказаў ксёндз у касцёле, тое вышэй, чым закон і загад начальства... Ксёндз Сабалеўскі з Індуры асабліва паважаны, і ён мне сказаў, што ў яго парафіі ні пагромаў, ні беспарадкаў не будзе, таму што ён папярэдзіў усіх з амбона, што не пусціць у касцёл нікога, хто чым-кольвек будзе заўважаны ў антыдзяржаўных учынках... З нашых праваслаўных святароў такі ж непадважальны аўтарытэт мае айцец Праневіч, уладальнік маёнтка Сухінічы, а propos, добры і сучасны гаспадар...

З рэвалюцыйных пракламацый у мястэчках Азёры, Скідаль, Лунна і Крынкі заўважаная брашура „Царская гаспадарка" „на местном белорусском наречии кириллическими буквами". Паколькі мова яе розніцца ад рускай і польскай і мясцовым сялянам цяжкая для чытання (!!), нічога па-за насмешкамі яна не выклікала. З іншай нелегальнай літаратуры ўсё на рускай мове і супраць вайны... Беларускі селянін мала давярае рэвалюцыйнай літаратуры, больш кірмашовым размовам, хоць у сувязі з вайной і „свабодай" паявілася цікавасць да сталічных урадавых газетаў, але мясцовыя і „патрыятычныя" („чорнасоценныя") газеты... успрымаюцца таксама, як рэвалюцыйныя. Беларускі селянін так і ўяўляе: што не „ад самога цара", тое „супраць цара"...

Да думку сельскіх старастаў, беларускі селянін на адкрыты масавы рабунак няздольны і сам па сабе ніколі на гэта не адважыцца, пакуль ёсць якая-кольвек улада... (Тое самае, што „действительный статский советник" Азнобішын пасля 1905 года, гаварыў „народны трыбун" і "крестьянин местечка Кринки" Сцяпан Анісімовіч яшчэ ў 1848 годзе: „Калі будзе вайна і прыйдуць французы з Касцюшкам, мы будзем гуляць!"... „Польскія пагромы панскіх двароў" на Беларусі былі ў 1917-м і 1939-м. Калі адна ўлада ўпала, а другая яшчэ не прыйшла...).

З падарожных запісаў Азнобішына цікава прачытаць пра масавае брукаванне пасля 1905 года двароў і вуліц у мястэчках і вёсках. Гэта быў хіба адзіны „загад начальства", які выконвалі адразу і нават з пэўнай ахвотай. Хоць і тут былі выключэнні, як у Крушынянах... Там праз адну стаялі „хаты татарскія" і „хаты мужыцкія", адны пісаліся „сялянамі", другія „мяшчанамі" ці нават „дваранамі" (шляхтай) — адны не хацелі рабіць „за татарскіх паноў", другія адказвалі першым „поўнай узаемнасцю"... (У праваслаўна-жыдоўскіх Крынках праблему бруку вырашылі іначай. Праваслаўныя вазілі пясок і камень за сябе і за жыдоў, а жыды заплацілі, каб не хадзіць да „бруднай работы" ...). Прыйшлося Азнобішыну збіраць у Крушынянах мужыцкі сход — збіраць татараў не меў права, бо „дваране"! — і „совестить". Трэба сказаць, што сход у Крушынянах прыняў не абы-якую пастанову: па-першае, зрабіць грашовую складку і стаць да работы адным мужыкам, па-другое, забрукаваць усе Крушыняны, і пад сваімі хатамі, і пад татарскімі, а потым запрасіць з Гродна „господина губернского инженера", па-трэцяе, калі інжынер усё абмерае і аблічыць у рублях „татарскую долю", падаць на татараў у суд і грошы адсудзіць... Калі пра такую „рэзалюцыю" пачулі татары, то прыйшлі на сход самі (!) і заявілі „кіньце прыдурвацца! трэба быць разам" — і так першы раз былі забрукаваныя Крушыняны.

У суседніх Вялікай і Малой Бераставіцах панамі былі, цётка і пляменнік, князі Патоцкія. Цётка жыла ў Парыжы, а немец-аканом высылаў ёй грошы і нідзе не мяшаўся... А малады князь Патоцкі ў другой Бераставіцы гаспадарыў сам, і быў ён „зерновой помещик", не „лясны", як Азнобішын — прадаваў збожжа і фураж для рускай арміі. Лес у Патоцкага стаяў, як „залаты запас" на будучыню... У Бераставіцу нейк прыехаў губернскі школьны інспектар з Гродна — і ўсіх збаламуціў. Кажа, можам адчыніць у вас „двухклассное народное училище", канешне, калі вы яго пабудуеце да верасня (!) вось паводле гэтага праекта, а з атэстатам такога вучылішча можна было хоць у войску застацца падафіцэрам, хоць у „панскі двор" наняцца дробным брыгадзірам, хоць вучыцца далей... Вёска сама ведала не горш Азнобішына, што яна перанаселеная, дзеці лішнія і трэба іх недзе выпіхнуць у свет. Так што Бераставіца сама (!) збеглася на сход, сама пастанавіла „збудаваць школу" і сама склалася грашыма на першасныя выдаткі... І ўтыкнуліся мужыкі ў дзве праблемы — зямля пад школьны пляц і лес на будову.

Зямля ў тутэйшых гаспадароў была, трох „багатыроў" мела больш 30 гектараў (!) кожны, іншыя па 5-7 га, але дзе! За вёскай, за лесам і балотам... А ў самой Бераставіцы зямлі не было, хіба што здаравенны царкоўны пляц — але ж царкоўны! І тут на гістарычнай сцэне першы раз паяўляецца малады князь Патоцкі...

— Мужыкі, што вы бегаеце? Купіце ў бацюшкі!

— А бацюшка кажа — пляц казённы, а ў мяне благачынны!

— Чаго вы да мяне не прыйшлі? — кажа Патоцкі. — Благачынны! З яго благачынным я граю ў карты ў Гродне ў дваранскім клубе, здаецца, мяне ён пакуль што слухае і чалавек пры памяці...

Так палова царкоўнага пляца перайшла з рук у рукі, і была цяпер школьным пляцам. Адна праблема адпала, і засталася другая — лес! Таму што ўвесь лес быў скуплены „на корню" мясцовымі жыдамі і як толькі жыды пачулі пра школу, цэны на лес выраслі чатырохкроць... Мужыкі ізноў збегліся на сход і ламалі галаву: ці скласціся і заплаціць „крывасмокам", хай задушацца... ці сваімі коньмі ехаць у Масты (!) і вазіць адтуль „па людзкай цане" — без дарог, за дзесяткі кіламетраў?! І тут другі раз паяўляецца малады князь Патоцкі...

— Мужыкі, што вы ізноў бегаеце?! Купіце лес у мяне! Зрэшты, на школу я дам за так — я Патоцкі, я не збяднею...

— Але ж, княжа, твой жа лес стаіць, ты не чапаеш...

— Не чапаю. А на школу дам. Толькі так — на адну школу. А то знаю я вас! У таго хлеў гнілы, у таго ў хаце дзве ніжнія падрубы...

— Але ж, княжа, але ж хіба мы калі што...

— Так што цяпер з праектам да майго лясніча, той абмерае і дасць запіску да лесніка. Той сам сякерай памеціць, а сячы і вывозіць будзеце самі... І ў лесе прыбраць за сабой, як лясніч скажа!

— Але ж, княжа, княжа...

Былі з той школай і іншыя праблемы. Сталярка, мэбля, печы, цэгла, кафля, жалеза, шыбы, дах, гонт... І крыку было, і шуму, і без жыдоў і печнікоў-татараў не абышлося, але да верасня школа стаяла, як панскі дом — „сем класаў з калідорам" і настаўніцкія кватэры. І прыехаў з Гродна той самы школьны інспектар, усё абмераў і кажа:

— Ну-с, одноклассная школа у вас может быть... Откроем вам школу, радуйтесь!

Аднакласная школа, калі коратка, тым рознілася ад „двухклассного четырёхлетнего (!) народного училища", што яе „атэстат" значыў тое самае, што „церковно-приходской", якая ў Бераставіцы была і чый „атэстат" значыў тое самае, што нічога. Мужыкі збялелі, але спыталі спакойна:

— А на чорта нам твая аднакласная! Сам жа казаў пра двухкласную, каб з атэстатам!

— Не положено, — кажа інспектар. — Положен школьный двор не менее одной десятины (1,1 га — А. Ч.), а у вас, я промерал, выходит всего 0,85 десятины...

Мужыкі не кінуліся біць інспектара, і нават у морду нагамі, але ізноў спыталі спакойна:

— А чаму ты пра дзесяціну адразу нам не сказаў, як вясной прыехаў і ўсіх збаламуціў?!

І тут інспектар ашаламіў усю Бераставіцу.

— А вы не спрашивали!

Цуд беларускі, але нават па такой шчырасці інспектара не білі нагамі, і паехаў ён з Бераставіцы з такой самай задаволенай мордай, з якой прыехаў... Правінцыйнае чынавенства кругом і заўжды тое самае. Гродзенскі інспектар не хацеў нават, каб тая Бераставіца ізноў склалася ў спадчыну і падала яму грошы „на лапу". Інспектар быў шчыра ўпэўнены, што няма нічога важней, чым яго інструкцыі, а для таго цэлы свет ведае тыя інструкцыі, як ён сам, хоць ніхто па-за ім тых інструкцый у вочы не бачыў, бо яны службовыя і ляжаць у шафе ў кабінеце...

Гісторыя мела свой happy end, і было ў Бераставіцы ў тую ж восень „двухклассное училище", бо малады князь Патоцкі граў у карты таксама ў Вільні, і то ў адной кампаніі з „попечителем" Віленскай навучальнай акругі, каму падлягала ўся асвета ў „пяці паўночна-заходніх губернях".

Азнобішын пісаў губернатару, што „беларускі мужык да таго цярплівы і абыякавы на свой лёс, што ён не пойдзе ні ў якую рэвалюцыю ні ад малазямелля, ні ад тых мерапрыемстваў урада „на далейшае паляпшэнне", аб якіх робіцца толькі горай, але нават беларускага мужыка здольны давесці да гневу такі вось губернскі школьны інспектар, сонны і раўнадушны, які выклікае толькі агіду, злосць і насмешку да ўсяе расійскай дзяржаўнай машыны — разам са мной і з Вамі, ваша высокаправасхадзіцельства...".

Губернатар прапусціў гэтую выснову міма ўвагі, і ні яе, ні ўвогуле школы ў Бераставіцы ў далейшых рапартах з Гродна ў Санкт-Пецярбург няма. Ні губернатар, ні міністр унутраных спраў, ні прэм'ер не былі дурнямі, але гнілы дзяржаўны апарат ніколі не прызнаецца, што ён гнілы. Гэтак хворы баіцца ісці да лекара, каб смерць не наклікаць. І развальваецца потым у тры дні, як Расійская імперыя зімой 1917 года...

Цікава, што Аляксандр Азнобішын паважаў у сваім пісьменстве стыль апісальны, і рэдка ўжываў высновы — як быццам пакідаючы іх „начальству" — але сам гэты спакойны спосаб пісьма, адны толькі простыя падзеі і выпадкі жыцця правінцыі самі па сабе любога нармальнага чалавека схілялі да адпаведных высноваў. Калі ж сам Азнобішын часам падводзіў рысу пад сваімі падарожнымі запісамі, то гэта быў як нейкі прысуд усім і кожнаму — і варта падаць толькі два прыклады, адзін агулам пра сялянаў, другі пра памешчыкаў, якіх было ў глухой Гродзенскай губерні разам 9/10 усіх яе насельнікаў.

— Нельга лічыць, што нашы сяляне жывуць добра, таму што спраўна плацяць падаткі. Бо гэтая спраўнасць у чатырох з пяці гаспадарак (!!) выходзіць за кошт жыцця на мяжы чалавечай годнасці, трымаецца толькі тым страхам, што за невыплату падаткаў адбяруць „царскую зямлю", атрыманую сорак гадоў назад у часы светлай памяці Аляксандра II... І я толькі Бога малю, каб ціхі і цярплівы мужык не даведаўся, што нашы памешчыкі, як рускія, так і польскія, не плацяць падаткаў па дзесяць і дваццаць гадоў (!!), жывуць на крэдыты Дваранскага Банку, і так жыве кожны трэці маёнтак...

— Безумоўна, — працягвае Азнобішын, — мне запярэчаць, што два з трох маёнткаў спраўныя. Але ж палова з іх абыходзіцца без машынаў і без сталых ці сезонных работнікаў, а наймае для працы тую самую вёску „за сноп дзесяты", „за кошык пяты" і „за воз сена", альбо ў нас сярэднявечная натуральная гаспадарка без грошай... Тыя ж „сучасныя маёнткі" ў большасці сваёй жывуць на продажу свае прадукцыі ў войска, інакш яны б даўно збанкрутавалі. А наша Гродзенская губерня, ваша высокаправасхадзіцельства, лічыцца ў сталіцы найлепшай і самай багатай ва ўсім „Северно-Западном Крае"...

Алесь ЧОБАТ